ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 10 (1647) | Пятніца, 2 лютага 1962 года. | Цана 4 кап.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

30—31 студзеня праходзіў IV пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Важнейшае пытанне для далейшага развіцця беларускай савецкай літаратуры — аб задачах пісьменніцкай арганізацыі ў сувязі з рашэннямі XXII з'езда КПСС — абмяркоўвалася на пленуме.

Гарачыя спрэчкі разгарнуліся пасля даклада старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў, дэлегата XXII з'езда КПСС Петруся Броўкі (тэкст даклада друкуецца ў сённяшнім нумары газеты). Удзельнікі пленума гаварылі аб той жыватворчай атмасферы, якая стварылася ў краіне пасля XX і XXII з'ездаў партыі, аб радаснай, натхнёнай працы народа, аб тым уздыме, які пануе цяпер у творчым жыцці.

Шмат увагі на пленуме аддадзена было высвятленню ролі мастака слова ў барацьбе за паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXII з'езда партыі. З пачуццём грамадзянскай адказнасці за ўсё, што адбываецца ў краіне, гаварылі пісьменнікі аб выкараненні са свядомасці людзей рэшткаў культу асобы, аб неабходнасці цеснай сувязі літаратараў і дзеячоў мастацтва з жыццём народа, аб няўхільным павышэнні літаратурнага майстэрства, ідэйнага і мастацкага ўзроўню твораў, прысвечаных нашай вялікай сучаснасці.

Усебакова абмяркоўваліся на пленуме праблема сучаснасці ў літаратуры, пытанні крытыкі і літаратуразнаўства, выхавання маладых пісьменнікаў, разглядалася дзейнасць выдавецтваў, часопісаў, кнігагандлёвых арганізацый.

У спрэчках па дакладу выступілі Н. Гілевіч, А. Карпюк, А. Бачыла, А. Русецкі, П. Кавалёў, Ул. Юрэвіч, Б. Сачанка, В. Барысенка, А. Макарэвіч, А. Зарыцкі, Ул. Стэльмах (дырэктар рэспубліканскага Тэатра юнага гледача), Р. Няхай, А. Вялюгін, І. Дорскі (дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм»), З. Матузаў (дырэктар Дзяржаўнага выдавецтва БССР), В. Кажэўнікаў, А. Адамовіч, А. Сакалоў (начальнік аддзела кнігі гандлёвага ўпраўлення Белкаапсаюза), К. Крапіва, Ул. Варно, К. Кірэенка.

З заключным словам выступіў П. Броўка.

На пленум беларускіх пісьменнікаў прыехалі маскоўскія госці — сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР В. Кажэўнікаў, старшыня праўлення выдавецтва «Советский писатель» М. Лесючэўскі, адказны сакратар «Литературной газеты» А. Прудкоў, перакладчыкі Я. Мазалькоў, М. Гарбачоў, прадстаўнікі Усесаюзнага радыё, маскоўскіх часопісаў.

На пленуме выступіў з прамовай сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі В. Ф. Шаура.

У рабоце пленума ўдзельнічалі загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ М. Ф. Капіч, міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў.

Пленум адзінадушна прыняў прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС.

Падрабязная справаздача аб рабоце пленума будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

Сабраўшыся на чарговы пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, мы, беларускія пісьменнікі, пасылаем ленінскаму баявому штабу нашай роднай партыі — Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза гарачае прывітанне і шчырую глыбокую ўдзячнасць за няспынныя клопаты аб літаратуры.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, цесна згуртаваны вакол яе, савецкі народ ідзе ад перамогі да перамогі, кладзе цагліну за цаглінай велічнага, светлага палаца камунізма. Гістарычны XXII з'езд КПСС вызначыў грандыёзную канкрэтную праграму пабудовы камуністычнага грамадства ў нашай краіне. «Цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме!» — урачыста абвясціла партыя ў сваёй новай Праграме. Тое, аб чым марылі лепшыя розумы чалавецтва, што завяшчаў правадыр Кастрычніцкай рэвалюцыі і стваральнік Савецкай дзяржавы вялікі Ленін, становіцца рэчаіснасцю.

Рашэнні XXII з'езда КПСС акрылілі, натхнілі ўвесь наш народ на новыя вялікія стваральныя справы, на новыя працоўныя подзвігі ў імя запаветнай мэты — камунізма. Усюды ў краіне кіпіць жыццё, поўнае творчага пафасу, рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя прыкладаюць усе сілы, змагаюцца за тое, каб намечаныя партыяй планы былі ажыццёўлены з поспехам. У працэсе стваральных спраў фарміруецца чалавек новых якасцей, чалавек высакародных учынкаў і пачуццяў, бязмежна адданы партыі і яе ідэям — будаўнік камунізма.

Савецкая літаратура не можа стаяць у баку ад велічных падзей, якімі жыве народ, краіна. Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў у сваіх выступленнях па пытаннях літаратуры і мастацтва з крыштальнай яснасцю акрэслівае задачы савецкіх пісьменнікаў, заклікае іх ісці ў нагу з жыццём, мацаваць сувязь з народам, праўдзіва і ярка адлюстроўваць ператваральныя справы савецкіх людзей, паказваць новага чалавека — нашага сучасніка ва ўсёй яго велічы і красе, быць актыўнымі памочнікамі партыі ў камуністычным выхаванні мас.

Беларуская літаратура дасягнула ў апошнія гады прыкметных поспехаў ва ўсіх яе жанрах. Яна развіваецца, дасягае новых вышынь у цеснай, непарыўнай садружнасці з літаратурамі братніх савецкіх народаў, уносіць пэўны ўклад у агульную скарбніцу шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Але ў нас яшчэ мала яркіх, паўнакроўных мастацкіх твораў аб сучаснасці, аб тых грандыёзных стваральных справах у нашай краіне, сведкамі якіх мы з'яўляемся. Мы яшчэ не стварылі высокамастацкіх вобразаў нашых сучаснікаў, вобразаў, якія б хвалявалі чытача, служылі яму прыкладам.

Мы разумеем сваю важную, пачэсную ролю ў камуністычным будаўніцтве і запэўняем Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі, што поўнасцю аддадзім свае здольнасці, свае творчыя сілы вялікай справе камунізма, далейшаму росквіту самай перадавой, самай прагрэсіўнай у свеце савецкай літаратуры.

XXII З'ЕЗД КПСС І ЗАДАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Даклад старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР П. БРОЎКІ

УСЕ МЫ ЖЫВЕМ сягоння тымі выключна вялізарнымі падзеямі, якія адбыліся ў нашай краіне за апошні час, рашэннямі XXII з'езда нашай роднай Камуністычнай партыі. Шмат задач у святле камуністычнага будаўніцтва пастаўлена перад усім савецкім народам. Шмат задач стаіць і перад намі, літаратарамі. Мы павінны абмеркаваць, што ж трэба зрабіць нашай беларускай мастацкай літаратуры, каб быць на ўзроўні таго, што патрабуе наш час. Да чаго нам трэба прымерацца? У нас ёсць вялікая мера, і да яе мы павінны падыходзіць са сваімі творамі,—гэта вялікая чалавечая душа, душа будаўніка камунізма.

Скончыў сваю працу з'езд, і ўсім стала ясна, што нам трэба працаваць па-новаму, як ніколі быць адказнымі за зробленае, за ідэйную накіраванасць твораў, за наша майстэрства, бо нідзе і ніколі ў жыцці літаратура не мела такога масавага высокапатрабавальнага і высокаадукаванага чытача, як літаратура савецкая, якая трымае адказ сёння не толькі перад сваім народам, а перад усімі народамі свету за тое, як яна здолее паказаць гэты першы ў гісторыі жыцця чалавецтва высакародны працэс пабудовы самага светлага, самага шчаслівага жыцця чалавека — камунізма.

Усім нам, каму давялося быць на XXII з'ездзе КПСС, і ўсім, хто пільна сачыў за яго работай, стала відавочна, што рашэнні з'езда партыі маюць сусветнае значэнне і, што, здзяйсняючы іх, трэба думаць больш усеабдымна, ведаючы, што за кожным нашым поспехам пільна сочаць прагныя да волі вочы чалавецтва. На з'ездзе прысутнічалі дэлегаты ад 80 зарубежных марксісцка-ленінскіх партый. Можна смела сказаць, што іхнімі вачыма сачыла за працаю з'езда ўсё прагрэсіўнае чалавецтва свету. У сваіх выступленнях зарубежныя сябры горача віталі найвялікшы дакумент нашага часу — Праграму Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пасля XXII з'езда ў свеце не стала абыякавых. Ёсць палымяныя выканаўцы і палымяныя прыхільнікі нашай Праграмы і ёсць яе ворагі. Але і ворагі збянтэжаны. Яны адчуваюць рэальную сілу Праграмы камуністаў, адчуваюць і тое, што ўсё цяжэй ім наперадзе будзе хлусіць і трымаць народы ў цемры. Бясспрэчна і тое, што яны прыкладуць усе намаганні, каб перашкодзіць святлу, якое ідзе з неабсяжных прасторaў нашай Радзімы, прасякнуць ва ўсе куткі свету, дзе, на жаль, яшчэ пануе капітал.

Мы ведаем, што лепшыя людзі свету з намі, што яны шчыра жадаюць поспеху нашым планам, але нам добра вядома і тое, што яшчэ даволі моцныя сілы, якія супрацьстаяць нам. Вось чаму ні на хвіліну мы не павінны паслабляць нашай ідэйнай пільнасці, рашуча змагацца з усялякімі вылазкамі імперыялістычнай рэакцыі, з усялякімі спробамі рэвізіяністаў нанесці шкоду развіццю літаратуры і мастацтва сацыялістычнага рэалізму.

СКЛАДАНАЯ і вельмі адказная задача стаіць сёння перад кожным будаўніком камунізма, у тым ліку і перад кожным працаўніком літаратуры і мастацтва. Але пасля XXII з'езда КПСС як ніколі вялізарныя нашы магчымасці, бязмежныя перспектывы, як ніколі мы маем поўную мажлівасць усім сваім розумам і сэрцам на ўсю сілу сказаць сваё слова аб нашым непаўторным часе, аб непаўторных яго героях, якія сваім розумам, сваімі рукамі ствараюць сапраўдны цуд на зямлі.

Усім вядома, якую вялікую шкоду нанёс развіццю нашай літаратуры і мастацтву культ асобы Сталіна. Культ Сталіна тармазіў, скоўваў, абмяжоўваў думку мастака і, вядомая рэч, збядняў творы мастацтва. Агульнавядомы і тыя цяжкія страты, якія панеслі ад культу савецкая літаратура і мастацтва. Нямала страціла і наша беларуская літаратура. У часе ўздыму беларускай мастацкай літаратуры, у часе яе надзвычайнага росту, культ асобы суровымі і жорсткімі рукамі абламаў і знявечыў галіны яе цвітучага дрэва і многім актыўным працаўнікам літаратуры і мастацтва давялося нізавошта адпакутваць у жахлівых умовах многія гады, а шмат каму разлучыцца і з жыццём.

Мы перажылі цяжкі час. Старэйшыя таварышы памятаюць, што без усхвалення культу асобы многім творам цяжка было знайсці дарогу ў свет. Занядбана была лірыка. Не дзіва, што рыторыка, оды, якія ўсхвалялі пануючы культ, не сыходзілі са старонак нашага друку. Усе мы аддалі пэўную даніну гэтаму. Нават такія мудрыя і непахісныя людзі, як нашы настаўнікі Янка Купала і Якуб Колас, шмат у сваіх творах ушаноўвалі культ асобы. Добра, што Якуб Колас пры жыцці здолеў многія свае лепшыя творы ачысціць ад гэтага наносу, а вось Купала прарабіць такую працу ўжо не мог. На вялікай частцы яго твораў савецкага перыяду і ляжыць гэты непатрэбны прывесак. І цяпер трэба думаць, што рабіць. Мне думаецца, што з тых твораў, у канцы якіх словы «вялікі Сталін» былі проста прычэплены, як віза для друку, гэтыя словы, неабходна зняць, бо самі творы добрыя і высокамастацкія, і ніякага дачынення да культу, апрача пэўнага прывеску, не мелі. Можа, мне скажуць, што гэта не зусім навукова, але гэта правільна. Бо мы ўсе добра ведаем, як ставіўся да культу Янка Купала і зусім перакананы ў тым, што, калі б ён жыў, ён з радасцю зрабіў бы гэта сам сягоння.

Дзякуючы мудрым рашэнням XX і XXII з'езда КПСС, савецкі народ пераадолеў шкоднае ўздзеянне культу асобы. Пераадолена і пераадольваецца яно ў літаратуры і мастацтве.

Але было б няправільна сцвярджаць, як спрабуюць некаторыя, што ўсё створанае ў час культу не заслугоўвае чіякай увагі. Нягледзячы на перашкоды, створаныя культам, савецкая літаратура і мастацтва раслі і развіваліся. У савецкай літаратуры і ў мастацтве ёсць выдатныя рэчы, якія з'явіліся і ў той час і якімі з поўным правам сёння ганарыцца наш народ.

Я думаю, што гэта відавочна ўсім нашым таварышам і, можа быць, скажаецца толькі тымі, хто б наогул хацеў закрэсліць усе нашы здабыткі ва ўсіх галінах жыцця.

МЫ ПЕРААДОЛЕЛІ рэшткі ўздзеяння культу і цяпер— поўныя сіл, каб працаваць з неаслабнай энергіяй.

Мы ўдзячны нашай роднай партыі, якая раскрыла нам незвычайна прывабныя далі для працы, якая зняла вялікія перашкоды са шляху развіцця нашай літаратуры і мастацтва, удзячны за тое, што яна вярнула да актыўнай, творчай работы многіх нашых сяброў, незаслужана пакараных. Мы рады, што яны ўключыліся ў нашу актыўную дзейнасць і сёння разам з намі аддаюць усе свае сілы як творцы і будаўнікі.

Мы працуем сёння адзіным, моцна загартаваным атрадам працаўнікоў савецкай літаратуры, як ніколі натхнёныя веліччу ідэй нашай роднай партыі, як ніколі натхнёныя той высокай ацэнкай, якую даў працаўнікам літаратуры і мастацтва Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў на XXII з'ездзе партыі:

«Савецкая літаратура і мастацтва трывала заваявалі высокі аўтарытэт ва ўсім свеце багаццем свайго ідэйнага зместу. Высокае прызнанне атрымала мастацкае майстэрства савецкіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, работнікаў кіно і тэатра...

Сіла савецкай літаратуры і мастацтва, метаду сацыялістычнага рэалізму—у праўдзівым адлюстраванні галоўнага і рашаючага ў рэчаіснасці. У сучасных умовах трэба ўдзяліць сур'ёзную ўвагу эстэтычнаму выхаванню, фарміраванню мастацкіх густаў ва ўсіх савецкіх людзей, аб'явіць рашучую барацьбу безгустоўнасці, у чым бы ня праяўлялася—у фармалістычных захапленнях ці ў мяшчанскіх уяўленнях аб «прыгожым» у мастацтве, у жыцці, у быце.

(Працяг на 2-й стар.).

У зале пасяджэнняў пленума праўлення СП БССР. Фота С. Чырэшкіна.

НАША ЗМЕНА

Працягваем размову аб беларускім тэатры.

Як выхоўваецца ў нас маладая акцёрская змена? Як клапоцяцца нашы тэатры аб мастацкім росце творчай моладзі?

Пра гэта ў сённяшнім нумары нашай газеты гаворыць народны артыст БССР Ц. Сяргейчык (г. Віцебск).

Наступнае слова — заслужанай артыстцы рэспублікі А. Клімавай.

Ц. СЯРГЕЙЧЫК,
народны артыст БССР.

——о——

РАЗМОВА, пачатая А. Звонкам і Д. Арловым, выклікала ў мяне думкі аб пераемнасці ў тэатральным мастацтве, аб нашай творчай змене. Гэта вельмі важнае пытанне. Сапраўды, тэатр, як і жыццё, заўсёды знаходзіцца ў руху. Калі мы будзем жыць толькі адным днём, без погляду ў будучыню, без імкнення наперад, мы рызыкуем безнадзейна адстаць ад задач часу і страціць перспектыву.

Толькі той тэатр можа смела глядзець у будучыню і не старэць, які дбайна выхоўвае маладую акцёрскую змену, здольную засвоіць і ўзбагаціць традыцыі сцэнічнага мастацтва.

Нашай моладзі давядзецца ў недалёкім будучым узначальваць тэатр і весці яго далей. Яна да гэтага павінна сур'ёзна рыхтаваць сябе — свой розум, сваё майстэрства і пачуццё адказнасці.

ТВОРЧАСЦЬ акцёра значна шырэйшая і глыбейшая за яго майстэрства. Трэба памятаць, што з маленькага чалавека ў нашым жыцці нельга стварыць вялікага акцёра на сцэне. Савецкі акцёр не можа разглядаць сваю творчасць і жыццё ў ёй, як вузка асабістую справу. І тое і другое належыць не яму, а творчаму калектыву, у якім ён працуе, а праз яго — усяму народу. Жыццё і народ вучаць нас, выяўляюць нашы здольнасці, узбагачаюць сваёй мудрасцю, ідэямі і пачуццямі. Яны ж натхняюць нас на творчасць, забяспечваюць патрэбным матэрыялам для яе і ўзнімаюць нас як творцаў. Наша акцёрская творчасць павінна быць выяўленнем волі, жаданняў, мар і надзей народа.

Успамінаючы пошукі свайго прызвання ў жыцці, аналізуючы ўласны творчы шлях, наглядаючы за сваімі вучнямі, сочачы за творчым лёсам многіх сталых і маладых акцёраў, я прыходжу да думкі, што тэатральная школа перш за ўсё павінна выхаваць мэтанакіраванага чалавека.

На маю думку, інстытут, вучылішча, студыя яшчэ не ствараюць акцёра. Стварае акцёра жыццё, тэатр і практыка, а вучыцца ў іх здольны толькі талент. Талент ад акцёра не залежыць, гэта справа прыродная. Але яго развіццё і майстэрства вызначаецца мерай патрабавальнасці, якую акцёр прад'яўляе сабе, залежыць ад упартай працы і настойлівасці.

У выхаванні мастака-грамадзяніна вялікая адказнасць кладзецца на нас, старэйшых таварышаў, на педагогаў, рэжысёраў, кіраўнікоў тэатраў і крытыкаў. Ці заўсёды мы з усёй адказнасцю падыходзім да гэтай важнай справы? Мне здаецца, што не. Перад моладдзю часта заігрываюць, ліберальнічаюць, патураюць ёй шмат у чым, робячы розныя скідкі на маладосць. А гэта шкодна, гэта толькі псуе маладых артыстаў. Яны тады толькі ведаюць свае правы і забываюць пра абавязкі.

Нядаўна ў нас у калектыве была сур'ёзная размова з моладдзю на гэту тэму. Там я з усёй праматой выказаў свае думкі. І што ж? Пасля такой размовы большасць моладзі паціскала мне руку і дзякавала. Значыць, маладыя людзі могуць усё зразумець і без заігрывання з імі.

Мы часам ставімся да акцёрскай моладзі вельмі непедагагічна. У некаторых рэцэнзіях на спектаклі нашых тэатраў сустракаюцца такія пахвалы ў адрас тэатральнай моладзі, ад якіх закружылася б галава ў любога вопытнага сталага акцёра. Дзе ж тут тая разумная патрабавальнасць, якая толькі і дае магчымасць развівацца таленту? Ці не таму і здараецца так часта, што блісне малады акцёр у пачатку сваёй дзейнасці, а потым на доўгі час гасне.

Атрымаўшы завышаную ацэнку сваёй працы, малады акцёр пачынае хварэць на геніяльнасць. Ён пагардліва ўжо адносіцца да сваіх таварышаў, у тым ліку і старэйшых, кажучы фігуральна, становіцца з мастацтвам «на ты». Не паспеўшы адыграць адзін-два сезоны ў тэатры, бяжыць у другі — шукаць «лёгкага хлеба». Яму не хочацца самому ствараць тэатр. Яму вальней жыць на ўсім гатовенькім. Гэтым ён абкрадае сябе духоўна і прафесіянальна, а праз некалькі год становіцца рамеснікам сваёй дзейнасці, а потым на доўгі час гасне.

Акцёр не можа расці, будучы ўвесь час «у бягах». Хутчэй за ўсё ён не прыжываецца нідзе.

ТЭАТР імя Якуба Коласа даўно ўжо стаў своеасаблівым інкубатарам па вырошчванню кадраў. Ён амаль што з першых год свайго існавання штодзённа клапоціцца аб сваёй акцёрскай змене. Наш тэатр дапамог сваімі кадрамі шмат якім тэатрам. І пры гэтым сам застаецца працаздольным і моцным. Варта ўспомніць, што мы далі беларускаму мастацтву трох дырэктараў тэатраў: Ул. Стэльмаха, І. Дорскага і Л. Валчэцкага; рэжысёраў К. Саннікава і Л. Мазалеўскую. У нас выраслі шмат хто з цяперашніх артыстаў Тэатра імя Янкі Купалы: П. Малчанаў, Р. Кашэльнікава, С. Станюта, Л. Шынко, П. Іваноў, М. Яроменка, Г. Арлова. Нашых выхаванцаў можна бачыць амаль што ў кожным тэатры рэспублікі і нават па-за межамі яе. Які тэатр здолеў бы расці і жыць паўнацэнным творчым жыццём, аддаўшы столькі сваіх людзей іншым, калі б ён не клапаціўся штодзённа аб сваім папаўненні і змене?

Калі яшчэ не было ў нас у рэспубліцы тэатральнага інстытута, тэатр меў студыю. Мы шукалі здольных людзей сярод удзельнікаў гурткоў мастацкай самадзейнасці. Перш чым дапускаць да экзаменаў, мы папярэдне пільна вывучалі іх. Шмат было патрачана часу на сяброўскія гутаркі з кожным. Пры дапамозе гэтых гутарак, непрыкметна для субяседніка, нібы рэнтгенам прасвечвалі іх чалавечую сутнасць. Кожны чалавек у дадзены пэўны час ёсць тое, што ён ёсць, не больш і не менш. Вось адгадаць у ім тое, што ён ёсць, вельмі цяжка. Але адгадаўшы —можна лёгка прадбачыць, чым ён можа стаць. І мы імкнуліся да такога прадбачання.

У часе вучобы студыйцы набывалі неабходныя веды і, удзельнічаючы ў народных сцэнах, выконваючы маленькія эпізадычныя ролі на сцэне тэатра, практычна засвойвалі іх ужо ў творчай садружнасці з усім калектывам. Яны засвойвалі творчы напрамак тэатра ўжо з першых год сваёй вучобы. У іх не было разрыву паміж тэорыяй і практыкай. Гэта былі дадатныя бакі студыйнага выхавання. Але былі і адмоўныя: студыя не магла даваць акцёру ўсебаковую агульнаадукацыйную падрыхтоўку. Ён павінен быў набываць яе самастойным шляхам.

Так мы выхавалі такіх цікавых акцёраў, як А. Шэлег, А. Трус, З. Канапелька, І. Матусевіч, А. Лапо, М. Яроменка, Я. Буракоў, Г. Арлова, М. Маркоўская, І. Тупік, Л. Куцькіна, А. Мельдзюкова і шмат іншых.

У апошнія гады, пасля заснавання Беларускага тэатральнага інстытута ў Мінску, тэатр, як правіла, папаўняе свае маладыя кадры з яго выпускнікоў.

Першыя выпускі далі нашаму тэатру вельмі мала акцёраў. Амаль усе яны не прыжыліся ў нас. У 1958 годзе да нас прыйшло з інстытута чатыры чалавекі, з іх засталося ў тэатры тры: Г. Гарбук, Е. Шабан і Т. Кокштыс. Годам пазней паступілі А. Смагіна і М. Цішачкін, а праз два — А. Яленская. Калектыў прыняў іх усіх вельмі ветліва, як ён заўсёды ўмее прыймаць моладзь. Маладыя акцёры адразу ўвайшлі ў рэпертуар тэатра. За два з палавінай сезона Г. Гарбук сыграў 17 роляў, Е. Шабан — 19, Т. Кокштыс — 10. А. Яленская за адзін толькі сезон сыграла 6 роляў. Не абыдзены ўвагай А. Смагіна і М. Цішачкін. Усе яны добра паказалі сябе, выявілі свае акцёрскія здольнасці, набылі значны акцёрскі вопыт.

Здаецца, ім бы жыць і радавацца, дужэць і авалодваць майстэрствам, заваёўваць новыя творчыя пазіцыі. Так яны ўвогуле і робяць. Але вось адзін з іх, якому больш за ўсё пашанцавала ў тэатры, ужо заяўляе: «Я пайду з тэатра». Чаму? Якія прычыны? Няма перспектывы росту? Ёсць. Няма кватэры? Ёсць. Стаўка? За два з палавінай гады два разы павышалі яе. У чым жа справа? Захвалілі і ў тэатры і ў друку, і захацелася чалавеку нямаведама чаго. Падай яму залатую рыбку! Не хачу я, маўляў, жыць у Віцебску, а хачу ў сталіцы! А пра тое, што моладзь едзе добраахвотна са сталіцы ў вёску ці на цаліну, ён не падумаў.

Наша моладзь часам пераацэньвае сябе і недаацэньвае таго, што робіць для яе тэатр. Яна забывае, што ўсё створанае ёю, гэта яшчэ не самастойная праца. Колькі даў нашай моладзі галоўны рэжысёр Ю. Шчарбакоў і іншыя рэжысёры? Колькі адабрала яна рэпетыцыйнага часу ад старэйшых акцёраў? Хіба прыемна было ім чакаць гадзінамі, пакуль рэжысёр дабіваўся ад кожнага з маладых патрэбнага гучання ў тым ці іншым кавалку ролі? Але чакалі, бо гэта неабходна тэатру. А колькі далі самі майстры сваім маладым партнёрам? Яны ж ведаюць, што чым мацнейшы партнёр, тым лягчэй з ім іграць, чым слабейшы — тым цяжэй. Але майстры ведаюць і другое: ад моцнага бяры і сам падцягвайся да яго, слабаму давай і падцягвай да сябе. У моцнага вучыся, слабаму дапамагай.

Для таго, каб з усёй паўнатой выявіць свой талент, навучыцца працаваць самастойна і быць глыбокім вытлумачальнікам сваіх роляў, неабходна ў першую чаргу жыць вялікай мэтай, гледзячы далёка ўперад. Жыццё ў мастацтве падобна на веласіпедную язду: будзеш глядзець перад сабой, не далей свайго носа — упадзеш, разаб'ешся. Будзеш глядзець далёка ўперад — можаш дасягнуць многага.

СПАЧАТКУ гэтага сезона з інстытута прыйшло да нас дзесяць чалавек. Тэатр упершыню прымае адразу такую колькасць маладых акцёраў. Былі пэўныя цяжкасці ў жыллёвым пытанні, аднак забяспечылі кватэрамі ўсіх. Можа, не так як хацелася б, але на першы час нядрэнна. Усе яны ўжо заняты і ў рэпертуары. Адны ў больших ролях, другія ў меншых. Кожны з іх сыграў з пачатку сезона па дзве, а некаторыя і па тры ролі, за выключэннем А. Коваль, якая мела толькі адзін выхад у спектаклі «Крыніцы». Зараз яна атрымала цікавую ролю Аляўціны Кротавай у п'есе Л. Шэйніна «Гульня без правілаў».

Маладыя артысты праявілі вельмі добрую ініцыятыву: паставілі сваімі сіламі на грамадскіх асновах казку С. Міхалкова «Гора баяцца, шчасця не бачыць», аддаўшы шмат часу і працы гэтай справе. Моладзь робіць добрае ўражанне. Рослыя, абаяльныя, з пэўнымі здольнасцямі, з агульнай культурай і прафесіянальнымі ведамі. Цікавяцца літаратурай, чытаюць газеты, часопісы. Ёсць сярод іх музычныя людзі. Але вось я яшчэ ні разу не бачыў, каб з іх хто-небудзь застаўся пасля рэпетыцыі, падсеў да піяніна і папрацаваў над сваім голасам. Скажаце, дробязь? Не, не дробязь. Гэты факт шмат пра што гаворыць. Мяне не так трывожыць тое, што яны пакуль што яшчэ кепска рухаюцца на сцэне, не заўсёды зносяцца з партнёрамі і маюць шмат іншых недахопаў. Гэта справа практыкі — справа нажытная! А вось тое, што яны не ходзяць на семінарскія заняткі па эстэтыцы, спасылаючыся на тое, што скончылі інстытут, і не працуюць над сабой — вельмі трывожыць. Без штодзённай вучобы і працы над сабой акцёр не можа расці. А расці ім неабходна і паскоранымі тэмпамі. Гэтага патрабуе само жыццё, бо маладосць акцёра хутка праходзіць, а майстэрства застаецца.

Дрэнна і тое, што яны да гэтага часу яшчэ процілпастаўляюць сябе калектыву. «Мы і яны», пры гэтым «яны» ўсё павінны рабіць для «нас», а «мы» — вольныя мастакі, хочам робім, хочам — не. Мы ні за што не адказваем. Адсюль і недысцыплінаванасць. Наглядаюцца ў некаторых і пагардлівыя адносіны да старэйшых таварышаў. Што, маўляў, нам старэйшыя! Мы іграем ужо большыя ролі, чым яны. Значыць, мы больш таленавітыя за іх. Адсюль і вынікае нелюбоў да маленькіх эпізадычных роляў, хоць некаторыя з іх ужо на практыцы паказалі, што можна і эпізадычныя ролі ствараць добра. Так, напрыклад, В. Караткевіч у спектаклі «Адзін год», маючы толькі некалькі слоў, стварыў запамінальны вобраз лазеншчыка. Гэтая маленькая праца павінна служыць прыкладам шмат каму з яго таварышаў. Яны павінны зразумець, што свабода акцёра ў самаабмежаванні, што творчасць наша калектыўная, што калектыўнасць — непарушны закон тэатральнага мастацтва. Сёння я іграю галоўную ролю, а заўтра эпізадычную. І тая і другая — патрэбны і мне і тэатру. Важна не тое, якую я іграю ролю, — важна тое, як я яе іграю. Трэба ўсвядоміць раз і назаўсёды, што аднаасобнікі ў нашым мастацтве шкодныя, а гастралёры не патрэбны.

Я ХАЧУ, каб мяне правільна зразумелі. Калі я сёння сканцэнтраваў увагу галоўным чынам на недахопах нашай тэатральнай моладзі, гэта не азначае, што я не бачу таго цудоўнага, станоўчага, што ёсць у яе. Станоўчае заўсёды гаворыць за сябе, а з недахопамі неабходна змагацца. Хібы нашай моладзі, аб якіх я гаварыў, магчыма і непазбежны, як з'явы ў час пераходу ад вучобы да прафесіянальнай працы ў тэатры. Наша задача заключаецца ў тым, каб памылак было як найменш. Мы ўсе ў адказе за гэта, разам з навучальнымі ўстановамі, якія яшчэ слаба наближаюць выхаванне будучых маладых акцёраў да вытворчай практыкі і творчага жыцця тэатраў, недастаткова аддаюць увагі камуністычнаму выхаванню артыстычнай моладзі.

У руках моладзі будучае нашага тэатральнага мастацтва. Гэта накладае на ўсіх нас вялікую адказнасць за маладую змену. Давайце ж разам успомнім залатыя словы А. М. Горкага: «Любіце працу. Ніякая іншая сіла не робіць чалавека вялікім і мудрым, як гэта робіць сіла працы — калектыўнай, дружнай, свабоднай працы».

Падзеі. Факты. Навіны

□ Дзейсна рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Савет СССР калектыў Мінскай абласной бібліятэкі імя А. Пушкіна. Бібліятэка папоўнілася літаратурай да выбараў, тут арганізавана пастаянная тэматычная выстаўка новых кніг, складзена картатэка «Насустрач выбарам у Вярхоўны Савет СССР» і рэкамендацыйны спіс літаратуры. Аддзелы абслугоўвання аформлены нагляднай агітацыяй.

□ Па запрашэнню слухачоў універсітэта культуры прыехалі ў раённы цэнтр Глуск і прынялі ўдзел у чарговых занятках пісьменнікі С. Грахоўскі, А. Русак і М. Скрыпка.

С. Грахоўскі зрабіў даклад аб задачах савецкай літаратуры ў святле гістарычных рашэнняў XXII з'езда КПСС. Потым пісьменнікі падзяліліся творчымі планамі і прачыталі свае творы.

□ Сталічныя тэатры — частыя госці ў раёнах рэспублікі. Напярэдадні выбараў у Вярхоўны Савет СССР тэатральныя калектывы выступаюць перад выбаршчыкамі з лепшымі спектаклямі.

Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў у калгасах «Памяць Леніна» Мінскага раёна, «Шлях да камунізма» Пухавіцкага раёна спектакль «Ляноніха на арбіце» па п'есе А. Макаёнка.

Тэатр юнага гледача выязджаў у Барысаў і Бярэзіну са спектаклямі «На граніцы» В. Белазёрава і «Дзяўчына з вяснушкамі» А. Успенскага.

XXII З'ЕЗД КПСС І ЗАДАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

Самае выдатнае — гэта праца чалавека, і няма больш высакароднай задачы, чым праўдзіва паказаць новага чалавека—працаўніка, багацце яго духоўных інтарэсаў, яго барацьбу супраць старога, аджываючага свой век. Мы павінны даць савецкім людзям цікавыя творы, якія раскрывалі б рамантыку камуністычнай працы, выхоўвалі б ініцыятыву і настойлівасць у дасягненні мэты.

Наша партыя ўпэўнена, што савецкая літаратура і мастацтва будуць і ў далейшым надзейнай зброяй савецкага народа, добрым і разумным дарадчыкам ва ўсім яго жыцці!»

Я не мог утрымацца, каб не прывесці гэтай даволі вялікай вытрымкі з прамовы таварыша Хрушчова, бо словы, сказаныя ім у дакладзе на XXII з'ездзе аб задачах літаратуры і мастацтва, і залатыя словы, запісаныя ў Праграме КПСС, прынятай з'ездам,—з'яўляюцца накіроўваючымі ва ўсёй нашай далейшай працы.

Як я ўжо гаварыў, на з'ездзе партыі была ўдзелена выключная ўвага справе развіцця савецкай літаратуры і мастацтва. Прынамсі аб гэтым сведчыць і тое, што на з'ездзе выступіла ажно пяць пісьменнікаў: Міхаіл Шолахаў, Мікалай Грыбачоў, Аляксандр Твардоўскі, Усевалад Кочатаў, Аляксандр Карняйчук.

Я не збіраюся спыняцца на выступленні кожнага з іх, але на тым галоўным, што было цёпла прынята дэлегатамі з'езда, мне б хацелася затрымацца. Міхаіл Шолахаў, які заўсёды дбае аб якасным росце савецкай літаратуры, сказаў аб тым, што сягоння хвалюе ўсіх нас і што характэрна для ўсёй шматнацыянальнай літаратуры, у тым ліку і для беларускай—аб здольным маладым папаўненні нашых радоў. «Адбываецца мала прыкметнае для чытача,—гаварыў ён,—але вельмі прыемнае з'явішча: цэлая плеяда маладых і сапраўды таленавітых пісьменнікаў, раней вядомых па апавяданнях у перыядычным друку, робяцца сталымі і вельмі абяцаючымі майстрамі слова. Гэта характэрна не толькі для рускай, але і для ўсіх нацыянальных літаратур».

Усе вы бачыце, што гэта ў пэўнай меры характарызуе і становішча беларускай мастацкай літаратуры. Але, адзначаючы рост таленавітай моладзі, М. Шолахаў гаварыў і аб высокіх патрабаваннях, якія стаяць перад пісьменнікамі, у тым ліку і перад маладымі. «Пісьменнік, які піша аб калгасніках або людзях саўгаса, памойму,—сказаў ён,—павінен валодаць ведамі ў галіне сельскай гаспадаркі не ніжэй за ўзровень хоць бы ўчастковага агранома. Той, хто піша пра металургічны завод, аб заводскіх рабочых, інжынерах і тэхніках, абавязаны ведаць вытворчасць, прынамсі, не горш за рабочага высокай кваліфікацыі. Той, хто прысвяціў сваю працу нашай арміі, абавязкова павінен ведаць вайсковую справу не горш за Купрына і Льва Талстога...»

Вялікія задачы стаяць перад савецкай літаратурай. Напярэдадні ўпартая праца над стварэннем новых высакаякасных твораў, але мы ганарымся тым, што ўжо нямала і зроблена намі. І правільна гаварыў Мікалай Грыбачоў, што «перад любымі суддзямі сучаснасці і будучыні мы з чыстым сумленнем можам заявіць, што савецкая культура, узгадаваная нашай партыяй у ідэалах камунізма, стварае і стварыла новага чалавека, духоўна багатага, гарманічна развітага,—Чалавека з вялікай літары...

Многанацыянальная савецкая літаратура, створаная за многія гады і рознымі талентамі, унесла свой дастойны ўклад у пабудову сацыялізма: у лепшых сваіх творах яна паставіла бессмяротны помнік духу і справе рэвалюцыі, паказала свету герояў з народа, сапраўдных рыцараў новага веку, улівала і ўлівае ў паток сусветнай літаратуры магутны светлы струмень свабодалюбнасці і чалавекалюбнасці. Гэта калектыўны вынік яе сумленнага служэння партыі і народу».

Вялікую ўвагу XXII з'езда партыі прыцягнула прамова Аляксандра Твардоўскага. Ён усхвалявана выказаўся аб праўдзівым адлюстраванні жыцця, аб высокай патрабавальнасці да майстэрства, якія павінны быць асноваю працы для сапраўднага пісьменніка. А. Твардоўскі гаварыў: «Некаторыя з нашых пісьменнікаў і крытыкаў гавораць аб неабходнасці «прыўзнімаць» рэчаіснасць у мэтах, так сказаць, надання ёй большай велічы і прыгажосці. Я належу да раду тых пісьменнікаў, якія лічаць, што дрэнная была б наша справа, калі б рэчаіснасць наша мела патрэбу ў гэткім прыўзніманні. Не, яна дастаткова высокая і велічная з усімі сваімі цяжкасцямі і недасканаласцямі, і размова можа ісці хіба што аб тым, каб мастакам прыўзняцца да яе».

Справе ўздыму майстэрства нашай літаратуры А. Твардоўскі аддаў выключную ўвагу: «Перад тварам новага духоўнага ўздыму нашага грамадства мы не павінны забывацца, што наследуем непасрэдна нашай вялікай класічнай літаратуры, якая аказала і аказвае ўладарны ўплыў на многія самыя развітыя літаратуры свету. І дастойнымі нашага вялікага часу мы здолеем быць, толькі будучы дастойнымі прадаўжальнікамі традыцый высокага майстэрства і маральнай сілы вялікіх папярэднікаў савецкай літаратуры. Мы павінны рашуча адкінуць думкі, якія не-не ды ўзнікаюць, на жаль, у нашым асяроддзі аб «сярэднім узроўні» як нармальным стане літаратуры, аб тым, што майстэрства — «справа нажыўная» і клапаціцца аб ім асабліва няма чаго. Такія размовы нічога, апрача шкоды, прынесці не могуць ні маладым, ні старым пісьменнікам, яны вядуць да прыніжэння нашай літаратуры, недааценкі яе магчымасцей, і галоўнае, прыносяць шкоду інтарэсам чытача».

Відавочна, што справа павышэння майстэрства — першачарговая задача савецкай літаратуры. Многа гаварылася аб гэтым і на апошнім пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.

Маючы на ўвазе высокую адказнасць перад нашым патрабавальным чытачом, дазвольце і мне сказаць некалькі слоў пра тое, што зроблена за апошні час у беларускай мастацкай літаратуры.

Мне б хацелася гаварыць аб усіх жанрах адразу, аб тым, што ў іх добрага і што благога, але становішча некаторых з іх выклікае пэўную заклапочанасць, і я думаю, што будзе лепш, калі мы разгледзім іх паасобку.

Пачну з прозы. Нельга не сказаць, што ў нас з'явіліся новыя цікавыя творы. Некаторыя з іх яшчэ не закончаны, але тое, што надрукавана, дае падставу спадзявацца, што творы будуць добрыя. Што ж выклікае трывогу? Тое, што можа і выпадкова, але большасць нашых сталых празаікаў адышло ад надзённых тэм і пытанняў. Калі мы звернем увагу на тое, што друкавалася летась у нашым тоўстым часопісе «Полымя», гэта будзе асабліва відавочна. Раманы і аповесці, надрукаваныя ў часопісе, у сваёй большасці накіраваны ў мінулае ці то вельмі далёкае, ці то больш блізкае, але гэта так. Я не хачу сказаць, што яны заганныя, наадварот, некаторыя з іх вельмі цікавыя. Усе мы добра разумеем, што такія творы не толькі маюць права на існаванне, але карысны і патрэбны нашаму чытачу. Я ўпэўнены, што ніхто з нас не будзе асуджаць таварышаў за выбар тае ці іншае тэмы, але калі бачыш, што побач з асвятленнем мінулага, вельмі мала, а то і нічога не робіцца, каб паказаць нашы сучасныя гераічныя дні, узнікае зусім законная заклапочанасць, якую павінны падзяліць усе мы.

Што ж надрукавана за мінулы год у «Полымі»?

Раман Міколы Лобана «На парозе будучыні» з часоў першай імперыялістычнай вайны (першая кніга з трылогіі «Шэметы»), раман Аркадзя Чарнышэвіча «Васценак Малінаўка», у якім адлюстроўваюцца падзеі ў беларускай вёсцы з часоў рэвалюцыі 1905 года, аповесць-легенда Уладзіміра Караткевіча «Раман Ракута» аб жыцці беларускіх сялян у час панавання літоўскіх феадалаў. З новых твораў аб Вялікай Айчыннай вайне надрукаваны раманы «Сустрэчы на ростанях» Аляксея Кулакоўскага і аповесць Васіля Быкава «Здрада».

Пра больш бліжэйшы час, аб першых гадах жыцця беларускага Палесся пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў надрукаваў першую кнігу рамана «Серадзібор» Піліп Пестрак. Аўтар узнімае адну з карэнных праблем заходняй часткі Палесся—праблему ператварэння палескіх зямель у высокаўрадлівыя, ператварэння гэтага нядаўна яшчэ захалуснага кутка ў квітнеючы край. Але сюжэтныя лініі рамана і вобразы, цікава задуманыя аўтарам, яшчэ не разгорнуты—відаць, гэта будзе зроблена ў другой кнізе.

Вялікую цікавасць выклікаў новы раман Івана Мележа «Людзі на балоце». Час дзеяння рамана—пачатак дваццатых гадоў. «Людзі на балоце»—першы з цыкла задуманых пісьменнікам раманаў аб Палессі, аб жыцці палешукоў пры Савецкай уладзе і аб іх барацьбе з балотамі. У гэтым рамане І. Мележ паказаў сябе, як добры знаўца быту палешукоў. Значна вырас ён у параўнанні з ранейшымі сваімі творамі як майстар слова, як мастак. У рамане яшчэ не адбываецца якіх-небудзь значных падзей. Савецкая ўлада толькі робіць у вёсцы першыя крокі, паволі разгортваецца класавая барацьба, сюжэт развіваецца пераважна ў сямейна-бытавым плане, але вобразы галоўных герояў—Васіля, Ганны, Яўхіма—вельмі яркія і запамінальныя. Раман І. Мележа—радасная з'ява ў нашай літаратуры.

Творы, памянёныя мною, маюць добрыя якасці, у аўтараў многіх з іх значна ўзрасло майстэрства, гэта творы, неабходныя нашай грамадскасці. Але віна не толькі іх аўтараў, а ўсіх пісьменнікаў, асабліва празаікаў, відаць, больш тых, якія мала або нічога не пісалі,—у тым, што побач з гэтымі творамі не з'явіліся на старонках часопіса творы аб хвалюючых днях нашай сучаснасці.

Вось і ў часопісе «Маладосць» надрукавана цікавая аповесць «Сыну майго сына» Алеся Асіпенкі. Гэта аповесць робіць своеасаблівую пераклічку пакаленняў, ставіць пытанне аб пераемнасці лепшых традыцый, што павінны пераходзіць ад пакалення да пакалення, аднак і тут празмерна расцягнутая аўтабіяграфія старога пенсіянера—удзельніка рэвалюцыйнага руху засланяе падзеі і адносіны паміж людзьмі сучаснасці.

Добры раман Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі». Раман патрэбны, але зноў жа на партызанскую тэму. Ніхто не супраць твораў аб гераізме нашага народа ў дні вайны, але бяда, што мала ў нас твораў аб гераізме народа ў дні мірнай працы.

А калі мы звернемся да апавяданняў, а іх надрукавана ў нашых часопісах за мінулы год некалькі дзесяткаў, то і ў іх, за выключэннем апавяданняў, напісаных маладымі, мы амаль не знойдзем водгукаў на хвалюючыя сучасныя тэмы. Усё гэта эпізоды з часоў вайны, або ўспаміны маленства, або замалёўкі пра юнацкае каханне.

Мне б хацелася, аднак, пры гэтым вылучыць цыкл апавяданняў. Гэта—апавяданні Янкі Скрыгана ў яго апошняй кнізе, прысвечаныя нашаму сучаснику, Міхася Лынькова пра Амерыку, новыя апавяданні з цыкла «Партрэты» Івана Шамякіна, некаторыя апавяданні Янкі Брыля, Рамана Сабаленкі. Заслугоўваюць увагі творы Аляксея Кулакоўскага аб Салігорску. Вельмі жывыя, напісаныя на добрым мастацкім узроўні кароткія навелы маладога аўтара Барыса Сачанкі.

Наогул я хацеў бы адзначыць, што маладыя празаікі праявілі больш ініцыятывы і часцей выступаюць з творамі, прысвечанымі надзённым тэмам. Вось некаторыя з іх: «Галасы на вадзе», «Жаніх» М. Ваданосава, аповесць на антырэлігійную тэму «Каця» і цыкл апавяданняў у часопісе «Маладосць» Л. Гаўрылкіна, апавяданні В. Карамазава ў «Маладосці» і «Полымі», аповесць А. Салаўёва «Сымонава люлька», апавяданні В. Хомчанкі, М. Стральцова.

Нашым старэйшым пісьменнікам трэба падумаць, чаму здарылася так, што яны адсталі ад паказу нашай сённяшняй рэчаіснасці? Хіба гады перашкаджаюць нам больш уваходзіць у жыццё, абцяжарваюць наша азнаямленне з жыццём? Гады ёсць гады, нічога супраць гэтага не зробіш, але яны ў нас яшчэ не такія, каб мы адрываліся ад жыцця.

Некаторыя разважаюць так: пісьменнік — удзельнік жыцця, ён павінен быць яго творцам, а навошта там розныя камандзіроўкі і азнаямленні... Можна пагадзіцца з тым, што самае найлепшае быць непасрэдным творцам жыцця, гэта якраз тое, пра што так клапоціцца М. Шолахаў, але нельга пагардліва ставіцца і да азнаямлення з жыццём. Можна даць добрыя прыклады і з нашай практыкі. Хіба сістэматычнае азнаямленне з жыццём Мінскага аўтазавода, паездкі ў Горкі, Волгаград не дапамаглі стварыць вядомы раман аб рабочым жыцці, аб будаўніцтве нашага горада Уладзіміру Карпаву? Раман Ул. Карпава, пры некаторых яго недахопах (дарэчы яны ўласцівы не толькі яму), карыстаецца вялікім поспехам у чытача, па ім праведзена ўжо дзесяткі канферэнцый чытачоў і гэта добрае сведчанне таго, як наш сённяшні чытач удзячны за творы, якія адлюстроўваюць яго жыццё. Ёсць і другія прыклады, якія пацвярджаюць тое, што толькі ў выніку дасканалага ведання жыцця з'яўляюцца добрыя творы. Ніхто не кажа, што распрацоўваць тэмы мінулага заганна. Творы аб мінулым таксама дапамагаюць фарміраванню камуністычнага светапогляду ў чытача, і гэта добра. Але недаравальна, калі пераважаюць творы пра мінулае і адсутнічаюць творы пра наш час. Так, на вялікі жаль, здарылася ў нас у апошні час з прозаю і гэта павінна выклікаць ва ўсіх нас заклапочанасць і нават трывогу. Трэба дамагчыся таго, каб у бліжэйшы час нашы празаікі рашуча павярнуліся тварам да сучаснасці. Мы ведаем, што над вялікімі палотнамі пра нашы дні працуюць Іван Шамякін і Тарас Хадкевіч, Уладзімір Карпаў не пакідае сваёй тэмы. Варта ж, каб і многія другія таварышы-празаікі зрабілі з сённяшняга становішча для сябе вывады.

Калі чытаеш нашу сучасную прозу, заўважаеш, што многія пісьменнікі ўпарта працуюць над павышэннем свайго майстэрства. У нас з'явіліся і добрыя майстры сюжэта вялікага рамана і майстры кароткага апавядання і навелы. Гэты рост відавочны, калі параўнаць сённяшні ўзровень нашых лепшых твораў з многімі творамі даваеннымі, не кажучы ўжо аб напісаных у першыя гады развіцця нашай літаратуры, што сталі класічнымі. Наша сучасная проза заваявала ўсесаюзнае прызнанне. Я не збіраюся прыводзіць шмат доказаў. Але ў чым, скажам, поспех Янкі Брыля? У тым, што ён—майстар са сваім выразным тварам і славіцца як мастак кароткага апавядання, навелы. Ён дасканала ведае пра што піша, верыш яму, як бы ўсё перажыў сам, добра ён адчувае чалавечую душу, мова яго твораў — народная, жывая, у кожным творы ён удумліва шукае, чым можна яе найглыбей узрушыць чалавечыя пачуцці.

Брыль не адзінокі. Ёсць у нас яго паплечнікі, якія так жа старанна працуюць і таксама заваявалі ўсесаюзнае прызнанне. Але ёсць у нас нямала яшчэ так званых «сярэдніх» рэчаў. Шэрых, бязлікіх. І ў іх як быццам усё правільна. І тэма важная. І героі расстаўлены разумна, як у добрага палкаводца на полі бою, а возьмешся чытаць, з вялікай цяжкасцю перагортваеш старонкі. У такога пісьменніка, калі ён возьмецца за пейзаж — на цэлы аркуш, калі пачнецца дыялог—няма канца. Чытаеш, так і хочацца перагарнуць аркуш, другі, і прымушаеш сябе прачытаць усё толькі па абавязку. Выйдзе такі твор, а тады пісьменнік дзівіцца, чаму ён доўга ляжыць на прылаўку.

Некалі ўсё, што ні выходзіла, у асноўным распаўсюджваў бібкалектар. Час цяпер змяніўся. Трэба думаць аб індывідуальным пакупніку, аб узросшых густах чытача. Заваяваць прызнанне можна толькі ўпартаю працаю над павышэннем майстэрства.

Тое, што сёння робіцца ў нашай рэспубліцы рукамі народа, тыя сапраўдныя маякі камунізма, якія ў ёй працуюць, заслугоўваюць таго, каб быць адлюстраванымі ў нашых творах. Пройдзе час і многія з нас будуць вельмі шкадаваць, што шмат чаго сапраўды непаўторнага і вялікаснага мы не заўважалі, недаравальна прайшлі міма, а трэба ведаць, бывае так, што і захочаш вярнуць, ды шмат чаго не вернеш. Вось чаму, як пра з'яву, якая заслугоўвае ўвагі, мне хочацца сказаць аб рабоце нашых пісьменнікаў у галіне нарыса. Не толькі многія нарысы, выдадзеныя раней, але і такія леташнія калектыўныя выданні, як зборнікі нарысаў «Героі нашых дзён» і «Людзі Прыдняпроўя», сведчаць аб аператыўнасці і неабходнасці гэтага жанра. Мы павінны і надалей арганізоўваць пісьменнікаў на стварэнне падобных калектыўных твораў. А тэм у нас невычэрпная крыніца.

Баюся, каб таварышы-празаікі не абвінавацілі мяне ў нейкай асаблівай прыхільнасці да паэзіі, але мне хочацца сказаць, што калі пазнаёмішся з тымі паэтычнымі творамі, што надрукаваны за апошні час, дык па некаторых з іх можна адчуць, чым жыве сёння сучаснік, як жывуць і працуюць нашы людзі на новабудоўлях, прадпрыемствах і ў калгасах.

Я не разглядаю гэтыя творы падрабязна, вядома, што яны розныя па якасці, а гэта залежыць ад таленту, ад майстэрства паэта, але накіраваны яны на тое, каб уславіць героіку нашых дзён. І тут мне хацелася б адзначыць вершы Сяргея Грахоўскага, Рыгора Барадуліна, Васіля Макарэвіча, Генадзя Бураўкіна—пра герояў вялікіх новабудоўляў нашай рэспублікі; творы Антона Бялевіча аб калгасным жыцці; лірычныя маналогі Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Максіма Лужаніна; вершы Пімена Панчанкі з яго роздумам аб вялікім ператварэнні свету, аб духоўным і палітычным вызваленні чалавека з-пад прыгнёту імперыялістаў; паэму Анатоля Вялюгіна, прысвечаную Леніну; вершы аб нашай сучаснасці Уладзіміра Дубоўкі, Кастуся Кірэенкі, Андрэя Александровіча, Міколы Хведаровіча, Міхася Машары, Васіля Віткі, Генадзя Бураўкіна, Алеся Звонака, Еўдакіі Лось, Станіслава Шушкевіча, Анатоля Астрэйкі, Пятра Прыходзькі, Ніла Гілевіча і іншых.



Але было б няправільна, калі б мы не бачылі, чаго яшчэ нашай паэзіі не хапае. А не хапае многага. Няма ў нас смелага, глыбокага погляду наперад, погляду ў будучыню. Вершы, у якіх аўтары спрабавалі глянуць наперад, звычайна—прымітыўныя, напоўненыя збітымі вобразамі. Тое, што сёння стваралася геніем савецкага чалавека ў імя будучыні,—гэта надзвычайна, а паэзія часта абмяжоўваецца рытарычнымі ўсхваленнямі і годзе. Гэта недаравальна!

Даўно ў нас не з'яўлялася добрай паэмы, і чытач засумаваў на пэўна па ёй. Я баюся, ці не зрабілі тут дрэнную паслугу некаторыя крытыкі і літаратуразнаўцы, якія выступалі з такімі сцвярджэннямі, што сюжэтная паэма непатрэбна, некаторыя з іх прызнавалі толькі гераічную паэму як баявую песню. Былі такія выказванні і ў «Літаратурной газеце» і ў рэспубліканскіх газетах. Нам трэба рашуча асудзіць іх. Тут нават непатрэбна нейкіх асаблівых тэарэтычных доказаў. Даволі прыгадаць «Новую зямлю» Якуба Коласа. Як было б добра, калі б знайшоўся мастак, які б здолеў так разгорнута, з такім веданнем жыцця, і так таленавіта паказаць нашага новага чалавека, які б сёння адшукаў сваю так званую «новую зямлю», свой кут, сваё шчасце, скажам, на Салігорскім камбінаце ці Полацкім нафтабудзе, на Беларускім аўтазаводзе ці Бярозаўскай ДРЭС. А хіба было б блага, калі б у нас з'явіліся паэмы, прысвечаныя новаму, мірнаму, гераічнаму часу, падобныя на «Сцяг брыгады» Аркадзя Куляшова ці на «Янука Сялібу» Максіма Танка?

Час нашым паэтам падумаць як належна пра стварэнне вялікіх паэтычных палотнаў. Я думаю, што добрыя з іх будуць чытацца з захапленнем і тымі, хто спрабуе сёння адмаўляць іх неабходнасць.

Вялікую працу прарабілі ў галіне песні Алесь Бачыла, Адам Русак, Анатоль Астрэйка і некаторыя іншыя таварышы. Але ім трэба зрабіць і папрок, што новай песні, песні, якая б паспрабавала глянуць у нашу будучыню, няма.

Паэтам трэба больш аператыўна працаваць над тэкстамі для плакатаў, пісаць вершаваныя лозунгі, частушкі. Неабходна вучыцца на добрым прыкладзе Уладзіміра Маякоўскага. Некаторыя кажуць, што творы Маякоўскага, напісаныя на надзённую тэму, не жывуць у наш час. Няпраўда! Усе мы з вялікім задавальненнем чытаем і сёння пра тое, як рабочы пераехаў у новую кватэру, і апавяданне рабочага Паўла Катушкіна аб набыцці аднаго чамадана і пра шмат што іншае.

Нашым паэтам трэба ўзмацняць грамадзянскія матывы. У некаторых крытыкаў ёсць няправільныя азначэнні характару паэзіі. Напісана, скажам, на грамадзянскую тэму—рыторыка, а калі суцэльнае сюсюканне—лірыка. Трэба ўзняць годнасць грамадзянскай паэзіі—сёння гэта вельмі актуальна. У гады пяцігодак, у гады Вялікай Айчыннай вайны з вершамі на вуснах будавалі і паміралі, вершы заклікалі да будаўніцтва новага жыцця, да змагання і барацьбы. Я не супраць хвалюючай сапраўднай лірыкі, але супраць вершаў бяздумных, супраць сюсюкання, супраць таго, што не акрыляе душу, а расслабляе яе.

Трэба пісаць пра усё, што хвалюе нас у жыцці. Не баяцца, што гэта здасца каму-кольвек і рытарычным. І Маякоўскага можна было абвінаваціць часам у рыторыцы, але гэта хай вызначаюць літаратуразнаўцы, я ж ведаю, што ўсе яго вершы жывуць і сёння і выклікаюць у сэрцы хваляванне, што яны і сёння выклікаюць жаданне зрабіць нешта добрае, светлае.

Можна было б абвінаваціць і Янку Купалу, што некаторыя яго вершы рытарычныя. Ну, возьмем, скажам, такія радкі:

Калі крывапіўцы —
Генералы царскія,
Аднавіць хацелі
Парадкі жандарскія.

*

Пад Чырвонай зоркаю
Ад рукі зладзейскае
Кроў лілася светлая
Чырвонаармейская.

. . . . . .

*

Пад чырвонай зоркаю
Устаў народ працоўны
І прагнаў за моры
Бандытаў каронных.

Ды вось прайшлі гады, а гэтыя вершы выклікаюць у мяне настрой тых часоў, і я ўяўляю за гэтымі, здаецца, простымі радкамі ўсю мужнасць верных сыноў Савецкай Радзімы, якія ўзняліся абараніць заваяваную свабоду.

Так што ёсць розная рыторыка. Яшчэ Бялінскі пісаў: «...Рыторыка рыторыцы не роўная, рыторыка Карнеля, Расіна і Вальтэра заўсёды будзе вышэйшая за рыторыку Озерава, а рыторыка Ламаносава вышэйшая за рыторыку Сумарокава. Ламаносаў усюды разумны, нават і ў рытарычных вершах сваіх».

Усё залежыць ад глыбіні думкі, ад умення яе падаць на паперы. Адзін паэт, скажам, піша пра якое-небудзь дрэўца ці ручай у сваім далёкім кутку, пра чалавека, які жыве ў глушы лясоў і робіцца вядомым на ўвесь свет, а другі, можа, надрываючыся, крычаць пра цэлы сусвет, а ведаць яго ніхто не ведае, ды і ведаць не хоча.

Уся справа ў тым, з якім майстэрствам напісаны твор. Мы не баімся і не павінны баяцца таго, што некаторыя тэмы як быццам непаэтычныя. Для добрага майстра няма непаэтычнай тэмы. Мы павінны праўдзіва адлюстроўваць жыццё, і мы імкнёмся да гэтага. Нам непатрэбна лакіроўка, цудоўнае не патрабуе ўпрыгожання, але нам непатрэбна і ачарнільства, якое часта выклікана імкненнем надаць вастрыню твору. Мы не баімся і не павінны баяцца гаварыць на ўвесь голас аб велічы і прыгажосці нашага жыцця. Яшчэ ў 1927 годзе Уладзімір Маякоўскі пісаў: «Надо мною небо—синий шелк. Никогда не было так хорошо!» А ў тым жа небе не было яшчэ Гагарына і Цітова. І мы з поўным правам можам іменна сёння сказаць, што ніколі не было так добра!

На з'ездах Камуністычнай партыі Беларусі таварыш К. Т. Мазураў неаднаразова зварочваў нашу ўвагу на адставанне беларускай драматургіі. Так яно было на працягу апошніх год. Прыемна, што 1961 год з'явіўся ў пэўнай ступені пераломным. Па п'есах нашых драматургаў атрымаліся добрыя спектаклі, якія заваявалі шырокае прызнанне гледача. Важна яшчэ і тое, што спектаклі гэтыя вельмі актуальныя, прысвечаныя сучаснасці. Перш-наперш хацелася б адзначыць п'есу Андрэя Макаёнка «Лявоніха на арбіце», якая была спачатку пастаўлена Тэатрам імя Янкі Купалы, а цяпер ідзе ў Маскоўскім тэатры Савецкай Арміі і па ўсёй Савецкай краіне больш, чым у 50 тэатрах. А. Макаёнак у сваёй п'есе востра крытыкуе прагу да ўласніцтва, тое, што сёння з'яўляецца перашкодай для нашага руху наперад. Ён умела бічуе адмоўныя з'явы ў жыцці. Новае, жыццёсцвярджальнае перамагае, і ў гэтым—пафас твора.

Поспех «Лявоніхі на арбіце» добра даводзіць, што калі ў аснове твора—правільны паказ рэчаіснасці, калі драматург умее вылучыць галоўнае, паказаць мэтанакіраванасць нашага жыцця, перамогу прагрэсіўнага над адмоўным,—вострая крытыка недахопаў жыцця робіць сваю карысную справу. Уся справа ў правільным асвятленні рэчаіснасці.

Станоўчую ацэнку атрымаў спектакль віцебскага Тэатра імя Якуба Коласа «Крыніцы», зроблены паводле рамана Івана Шамякіна аўтарам разам з рэжысёрам Ю. Шчарбаковым. Усе, хто бачылі спектакль у Мінску, аднадушна гавораць аб ім як аб вялікай удачы нашага тэатральнага мастацтва. У спектаклі праўдзіва, светла і аптымістычна раскрываецца жыццё сельскай інтэлігенцыі, нягледзячы на тое, што вельмі востра крытыкуюцца недахопы нашай рэчаіснасці.

Створана Пятром Васілеўскім патрэбная п'еса на вельмі важную тэму аб жыцці і працы рабочай моладзі Салігорскага калійнага камбіната—«Любоў, Надзея, Вера...». І хоць у спектаклі па гэтай п'есе (Тэатр імя Я. Купалы) нямала недахопаў, асабліва ў кампазіцыі твора, ён глядзіцца з цікавасцю. У ім многа сапраўднай рамантыкі з жыцця моладзі.

Малады драматург Іван Козел, якога ўсе ведаюць па п'есе «Папараць-кветка», напісаў новую п'есу «Над хвалямі Серабранкі». П'еса пастаўлена Тэатрам юнага гледача. Яна выразна раскрывае ўсю заганнасць прагі да ўласніцтва. Героі п'есы—людзі сённяшніх дзён. Багатая народная мова п'есы.

Варта адзначыць яшчэ два драматургічныя творы гэтага часу, а менавіта—п'есу Івана Шамякіна «Выгнанне блудніцы» і п'есу «Сэнс яе жыцця» А. Гутковіча і Ф. Казоўскай.

Поспехі нашай драматургіі за апошні час відавочныя, аднак мы не павінны заспакойвацца. Трэба думаць пра тое, каб гэтыя поспехі былі замацаваны і яшчэ больш павялічаны новымі творамі. У нас ужо ёсць п'есы, якія чакаюць свайго выхаду на сцэну: «Вера Харужая» Алеся Звонака, «Сцеражыцеся, Мякішавы!» Аркадзя Маўзона, «Калі гэта каханне» Мікалая Гарулёва, «З кім ідзеш» Пятро Васілеўскага. Як вядома і яшчэ многія таварышы працуюць над драматургічнымі творамі. Пажадаем жа, каб пасля іх сцэнічнага ўвасаблення, мы атрымалі спектаклі, за якія б нам падзякаваў глядач.

Многа мы гаварылі аб удзеле пісьменнікаў у кінематаграфіі. У мінулым годзе нават пленум праўлення Саюза пісьменнікаў прысвяцілі гэтаму пытанню, а вынікаў належных пакуль што няма. Уся справа ў добрых сцэнарыях. А большасць іх, вядомая справа, павінны стварыць пісьменнікі. Нам нельга ні на хвіліну забывацца аб гэтым і ўсяляк падтрымліваць кожнага, хто актыўна бярэцца за кінадраматургічны твор. Паміж пісьменнікамі-сцэнарыстамі і кіраўніцтвам студыі «Беларусьфільм» у мінулым было многа непаразуменняў. Трэба думаць, што з прыходам новага кіраўніцтва кінастудыі нашы ўзаемаадносіны наладзяцца на карысць справе. Разам са студыяй мы склікаем у хуткім часе семінар сцэнарыстаў і рэжысёраў. Можна спадзявацца, што іх сумесная праца дасць плённыя вынікі.

Хацелася б адзначыць некаторыя нашы дасягненні і ў справе стварэння новых опер і балетаў і ў першую чаргу працу нашага ўжо вядомага лібрэтыста Алеся Бачылы.

Усё яшчэ мала ў нас твораў для самадзейнасці, асабліва п'есаднаактовак. Ствараючы п'есы для прафесіянальных тэатраў, нельга забывацца пра сотні тэатральных пляцовак народных тэатраў, дамоў культуры, клубаў, адкуль гучыць для шырокіх мас наша мастацкае слова.

Звычайна на ўсіх нашых сходах і пленумах прынята гаварыць аб адставанні літаратурнай крытыкі. І сапраўды, калі параўнаць зробленае крытыкай і літаратуразнаўствам з плёнам усёй літаратуры, дык можна сцвярджаць аб некаторым адставанні. Але, калі мы паглядзім на тое, што зроблена беларускімі крытыкамі і літаратуразнаўцамі за апошні час, дык павінны адзначыць вельмі значны зрух у гэтай галіне. У нас у год выходзіць цяпер па дзесятку кніжак, у якіх разглядаецца сучасная літаратурная творчасць і грунтоўна даследуюцца самыя розныя галіны развіцця нашай літаратуры.

Вось пералік такіх кніг, якія заваявалі сёння шырокую ўвагу чытача: «Культура творчасці» і «Беларускі раман» Алеся Адамовіча, «Старонкі братняй дружбы» Сцяпана Александровіча, «Паэзія праўды» і «Спадарожніца часу» Рыгора Бярозкіна, «Літаратура і жыццё народа» Якава Герцовіча, «Беларуская байка» Янкі Казекі, «Паэзія змагання» Уладзіміра Калесніка, «Аб мастацкай прозе» Алеся Кучара, «Міхась Лынькоў» Фёдара Куляшова, «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура» і «Новая зямля» Якуба Коласа» Алега Лойкі, «Проза Кузьмы Чорнага» Міколы Луферава, «Тэатр у вогненныя гады» і «Сучасны беларускі тэатр» Уладзіміра Няфёда, «Янка Купала — перакладчык» Дзмітрыя Палітыкі, «Шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры 20—30-х гадоў» Навума Перкіна, «Беларуская савецкая проза» Юліяна Пшыркова, «Беларуская драматургія. Дакастрычніцкі перыяд» Антона Семяновіча, «Змітрок Бядуля» Міхася Смолкіна, «Піліп Пестрак» Кузьмы Хромчанкі, «Драматургія Янкі Купалы» Міхася Яроша, кніга Сцяпана Майхровіча пра Янку Брыля і іншыя.

Як бачыце, нават адзін толькі пералік робіць пэўнае ўражанне. А трэба сказаць, што многія з гэтых кніг заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі, бо вызначаюцца добрымі якасцямі: глыбінёй аналізу, багаццем думак і яркай формай, якая захапляе чытача.

Ажыўленне на нашым крытычным і літаратуразнаўчым фронце відавочнае. Гэтаму вельмі спрыялі ўмовы, створаныя для развіцця ўсяго жыцця нашай краіны пасля XX з'езда КПСС. З'явіліся даследаванні, настойлівыя творчыя пошукі, з'явіліся, хай першыя, такія творы, якія імкнуцца паказаць сапраўдны гістарычны працэс развіцця беларускай мастацкай літаратуры, адкідаюць вульгарызатарскія сцвярджэнні, запаўняюць той правал, які з'віўся ў выніку дзеяння культу асобы, канкрэтнымі гістарычнымі фактамі. У гэтым сэнсе заслугоўваюць увагі дзве працы, якія выйшлі ў нас нядаўна,—Н. Перкіна і Ю. Пшыркова, прысвечаныя высвятленню становішча беларускай мастацкай літаратуры ў 20—30-х гадах. Гэтыя кнігі выклікалі шмат размоў. Адбылася грунтоўная, цікавая гаворка і ў Саюзе пісьменнікаў пасля даклада Якуба Усікава. Хоць і ў дакладзе і ў выступленнях было многа і спрэчнага, але, як кажуць, спрэчкі на карысць высвятленню ісціны. Што добрага ў працах т. т. Перкіна і Пшыркова? Добра тое, што сваімі кнігамі, пасля доўгіх год выпустошвання, скажэння карціны развіцця беларускай мастацкай літаратуры, яны зрабілі спробу паказаць сапраўднае становішча яе ў 20—30-х гадах. У пэўнай меры яны і дасягнулі гэтага. Кожны з нас, хто быў сведкам і ўдзельнікам гэтага развіцця, можа адзначыць, што крытыкамі прароблена вялікая і высакародная праца ў гэтым напрамку, якая заслугоўвае станоўчай ацэнкі.

Але ёсць у гэтых працах і пэўныя хібы. Тлумачыцца гэта, відаць, тым, што аўтары не зусім дасканала ведаюць абставіны таго часу і развіццё літаратурнага працэсу, бо самі не з'яўляліся непасрэднымі ўдзельнікамі яго. Вось чаму спроба характарыстыкі літаратурна-мастацкіх арганізацый не зусім адпавядае сапраўднасці. Адсутнічае прынцыповая ацэнка некаторых падзей, якія адбываліся ў той час. Гэта было заўважана і на абмеркаванні ў Саюзе пісьменнікаў. Як правільна адзначыў Пятро Глебка, некаторыя прамоўцы спрабавалі асвятляць літаратурны працэс таго часу з пазіцый уседаравання і ўсепрыняцця.

Таварышы, якія робяць удзячную справу, калі можна так сказаць,—справу аднаўлення ісціны, павінны добра разумець, што ісціна павінна быць сапраўднаю ісцінай. Нельга абяляць таго, што было ў развіцці нашай літаратуры нядобрым і прыкрым, нельга абыходзіць таго, што класавая барацьба была ў той час востраю, нельга абыходзіць моўчкі пастаноў партыі, якія выпраўлялі становішча і накіроўвалі развіццё літаратуры па належнай плыні. Я не магу пагадзіцца з некаторымі выступлен

XXII З'ЕЗД КПСС І ЗАДАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

чаны гэтай тэме. Трэба, каб таварышы падрыхтаваліся да сур'ёзных і практычных размоў, якія б дапамагалі ў гэтай важнай справе.

УСЁ БОЛЬШ з'яўляецца ў нас цікавых кніг для дзяцей. Вось што выйшла за апошні час: аповесці П. Кавалёва «Лёнька Гром», А. Якімовіча «Смелыя людзі», А. Шашкова — «Лань — рака лясная», П. Валкадаева «Чый хлопчык?», В. Сіманавай «Кухаронак», зборнікі апавяданняў В. Хомчанкі «Рукавіцы генерала Даватара», Ул. Мехава «Помнік герою», «Родны край» В. Вольскага, двухтомнік Я. Маўра, аповесць Хв. Жычкі «Піфагоравы штаны», аповесць Ул. Шахаўца «Крылаты дзень», зборнік А. Пальчэўскага «Аля і Галя», апавяданні М. Гамолкі «Шлях адкрыты», новая паэма «Незвычайныя канікулы» і вершы пра дзяцей Балгарыі Э. Агнящвет, казкі Ул. Дубоўкі «Дзівосныя прыгоды» і В. Віткі «Пра цара Зубра», зборнікі вершаў К. Кірэенкі, С. Грахоўскага, А. Платнера, С. Шушкевіча, М. Машары, Н. Гілевіча, А. Вольскага, Е. Лось, М. Хведаровіча.

Як бачыце, кніг нямала. Ёсць тут кнігі пра вайну і пра наш дзень, ёсць і казкі. Але вельмі мала кніг, якія б знаёмілі нашых дзяцей з тым, чым жыве наш савецкі чалавек сёння, з яго гераічнымі справамі на вялікіх будоўлях, мала і пра жыццё саміх дзяцей, пра школу, працу, піянерскія лагеры. Вельмі мала кніг, прысвечаных навуковай фантастыцы.

У нас даволі моцны атрад пісьменнікаў, якія з поспехам працуюць у літаратуры для дзяцей. З'явіліся і новыя імёны: Георгій Шыловіч, Яўген Курто, Віктар Шымук, Павел Ткачоў, Алена Філімонава-Кобец, Міхаіл Герчык, Яраслаў Пархута, Валерый Высоцкі, Васіль Зуёнак, Мікола Чарняўскі.

Трэба спадзявацца, што ў бліжэйшы час яны здолеюць даць нашым дзецям больш цікавых кніжак, якія б па-сапраўднаму выхоўвалі тых, хто будзе будаваць камунізм і жыць пры камунізме.

УСЁ, ШТО прароблена намі за апошні час, сведчыць аб пэўным росце нашай літаратуры, асабліва за час пасля XX і XXII з'ездаў КПСС, калі была адкрыта ў поўным сэнсе «зялёная вуліца» ўсім творчым дараванням. Мы з'яўляемся сведкамі выхаду новых цікавых твораў, мы бачым, як шырокаю плынню ідуць новыя творчыя сілы ў нашу літаратуру.

Вось хто прыйшоў да нас толькі ў галіне прозы і паэзіі: Уладзімір Дамашэвіч, Васіль Макарэвіч, Леанід Гаўрылкін, Генадзь Кляўко, Яўген Каршукоў, Анатоль Вярцінскі, Мікола Аўсеенка, Данута Бічэль, Іосіф Куралікаў, Алесь Наўроцкі, Міхась Стральцоў, Уладзімір Ляпёшкін, Віктар Карамазаў, Ігар Шклярэўскі, Уладзімір Верамейчык, Альберт Салаўёў, Мікола Кусянкоў, Анатоль Дзяляндзік, Іван Летка, Мікола Гроднеў, Анатоль Грачанікаў, Віктар Дайліда, Хведар Чэрня, Аляксандр Шлег і іншыя. Многія сябе ўжо добра зарэкамендавалі сярод чытачоў. Што яшчэ важна — многія працуюць непасрэдна на вытворчасці, а гэта дае ўсе магчымасці спадзявацца, што ў бліжэйшыя гады яны здолеюць узбагаціць беларускую мастацкую літаратуру новымі цікавымі творамі.

Гэта аб нашым самым апошнім папаўненні, а многія з тых, што прыйшлі ў нашу літаратуру некалькі год раней, з'яўляюцца сёння яе асноўнымі кадрамі. Іхнія рэчы ўсё больш запаўняюць старонкі нашых часопісаў, іхнія кнігі ўсё часцей выходзяць асобнымі выданнямі. Большасць іх імкнуцца і часта глыбока раскрываюць з'явы нашага жыцця, паказваюць працоўны гераізм нашых людзей, спрабуюць глыбока раскрыць духоўны вобраз савецкага чалавека. Але ёсць і ў працы нашых малодшых таварышаў пэўныя зрывы. Мне б хацелася некалькі слоў сказаць аб рамане Івана Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях». І. Пташнікаў, як усім вядома, празаік здольны, ён паказаў сябе ў ранейшых творах аўтарам, які ўвесь у пошуках, які імкнецца пісаць цікава, мець сваё адметнае творчае аблічча. Многа працуе ён над узбагачэннем сваёй мовы. Усё гэта якасці добрыя. Варта сказаць і пра якасці адмоўныя.

У рамане «Чакай у далёкіх Грынях» І. Пташнікаў у пагоні за лішняй займальнасцю надзвычай многа надае ўвагі інтымным адносінам сваіх герояў, а агульная ідэя твора невыразная. Чаму большасць яго герояў надзелена адмоўнымі якасцямі, невядома. Хіба гэта сапраўднае аблічча савецкіх маладых людзей? Няпраўда! Мы ведаем, што ў нас ёсць яшчэ і такія людзі, у якіх, як кажуць, нічога няма святога, але гэта ж выключэнне. Хіба так ставяцца да кахання, да жанчыны нашы маладыя людзі, як многія героі рамана І. Пташнікава, хай сабе некаторыя з іх і адмоўныя?

Мне не асабліва хацелася крытыкаваць раман І. Пташнікава, празаіка маладога, здольнага, калі б гэтыя заганы трапілі ў раман выпадкова, па неразуменню, па нявопытнасці маладога аўтара. На жаль, у дадзеным выпадку іншае. Аўтар упарта чапляецца за гэтыя адмоўныя мясціны, думаючы, напэўна, усё аб той жа псеўдазаймальнасці. Бо інакш, чым жа вытлумачыць тое, што пасля таго, як рэдкалегія «Маладосці» і рэдактар часопіса П. Панчанка настойліва раілі яму выкінуць з рамана пэўныя раздзелы і гэткія мясціны, ён усё ж панёс у выдавецтва раман, ні ў чым не паслухаўшыся іх.

І. Пташнікаў павінен выправіць усё, што патрэбна ў рамане, і, наогул, як след папрацаваць над ім, а таксама ўлічыць і зразумець што варта ўважліва прыслухоўвацца да калектыву і да старэйшых таварышаў, якія жадаюць яму дабра.

Прыемна, што большасць нашай літаратурнай моладзі правільна разумее сваю працу, як працу цяжкую, якая патрабуе шмат сіл і шмат часу, разумее, што за знешнім вобразам жыцця чалавека трэба паказваць унутраны змест яго. Нельга захапляцца вонкавым выглядам дамоў, не заглядаючы, а што за пакоі, а што за выгоды ўсярэдзіне. Нельга толькі па прыгожых гарнітуры і капялюшы вызначаць якасці чалавека. Трэба, як кажуць, глядзець у корань. І сапраўды, апяваючы прыгожы дуб, мы не забываемся пра тыя магутныя карэнні, якімі ён трымаецца зямлі, і якія даюць яму жыватворныя сокі. Прыемна, што многія нашы маладыя пісьменнікі, і асабліва паэты, шукаюць. У асноўным пошукі гэтыя — здаровыя, сапраўды творчыя. Трэба перасцерагчы нашу моладзь, каб яна не займалася пошукамі дзеля пошукаў, бо гэта прыводзіць да непатрэбнага крыўляння, каб яна заўсёды памятала, што перад ёй чытач, чытач-творца, чытач-будаўнік, што патрабуе слова, якое б яго натхняла на працу, а не крывіла ягоны твар ад неразумення, чаго хоча аўтар.

Непасрэдны ўдзел у жыцці, цесная сувязь з жыццём, пастаянная вучоба — вось што асабліва неабходна пісьменніку. Трэба сказаць, што Саюз пісьменнікаў Беларусі імкнецца многае рабіць у гэтым напрамку, але, бясспрэчна, недастаткова. Ёсць нездавальненне ў часткі маладых пісьменнікаў і нездавальненне слушнае, бо некаторыя з іх застаюцца як бы паза ўвагаю саюза. Абмінаюцца яны і ў творчых камандзіроўках у межах рэспублікі і пры пасылцы розных брыгад па-за межы рэспублікі, мала мы гутарым з імі, мала прыслухоўваемся да іх інтарэсаў, недастаткова займаемся іхнім побытам.

Мне здаецца, што добрае слова можна сказаць аб нашай сатыры. Тое, што ў нашых умовах такі часопіс, як «Вожык», мае тыраж больш за 50 тысяч, сведчыць аб станоўчай рабоце пісьменнікаў-сатырыкаў. Важна, каб надалей яны па-сапраўднаму ўлічылі словы Мікіты Сяргеевіча Хрушчова аб тым, што вострае слова сатыры сёння павінна яшчэ больш актыўна дапамагаць нам у будаўніцтве. Нарада сатырыкаў, якая нядаўна адбылася ў нас, сведчыць аб тым, што беларускія сатырыкі разумеюць сваю задачу. Хацелася б, каб сатырычныя творы іх знаходзілі сваё месца не толькі на старонках «Вожыка», а каб з'яўляліся часцей і ва ўсім перыядычным друку і ў тым ліку ў літаратурна-мастацкіх часопісах.

Многа сярод нас было размоў аб гісторыі беларускай літаратуры і размоў па-сапраўднаму слушных. Бо сапраўды тое, што ў нас выдадзена па гэтым пытанні, цяпер, пасля XX і асабліва пасля XXII з'езда КПСС, не адпавядае праўдзіваму паказу гістарычнага працэсу развіцця беларускай мастацкай літаратуры. Усім нам вядома, што ў гэтым віна таго ж культу асобы. Многае не знайшло належнага адлюстравання ў «Нарысах гісторыі беларускай літаратуры». Цяпер створаны ўсе ўмовы для напісання такой гісторыі, якая б праўдзіва і ўсеабдымна адлюстроўвала літаратурны працэс. У Маскве, ды і ў нас, вядзецца шмат гаворак і дыскусій вакол таго, як арганізаваць напісанне такіх кніг. Патрэбны манаграфіі пра асобных пісьменнікаў ці не? Цяжка сягоння сказаць нешта катэгарычнае. Ясна адно, трэба імкнуцца да таго, каб развіццё нашай літаратуры знайшло найбольш поўнае адлюстраванне і каб у імя паказу творчага шляху аднаго пісьменніка не выпадалі іншыя, якія адыгралі пэўную ролю ў стварэнні літаратуры.

Наспеў час пацікавіцца тым, як выкарыстоўваюцца літаратурныя творы ў падручніках і хрэстаматыях для нашых школ. Мы разумеем, што творы для падручнікаў і хрэстаматый падбіраюцца паводле школьных праграм. Але і праграмы не павінны быць вечнымі. Мяняецца жыццё, расце літаратура, пэўныя змены павінны знаходзіць свой адбітак і ў праграмах. Варта яшчэ звярнуць сур'ёзную ўвагу на якасць літаратурных твораў, якія ўваходзяць у праграмы. Вельмі важна пры гэтым мець на ўвазе развіццё эстэтычнага густу ў нашых дзяцей. Значыць, адбіраючы для падручніка той ці іншы твор, трэба глядзець не толькі на яго ідэйны змест, а і на тое, ці па-мастацку ён напісаны, ці прыцягне, ці ўсхвалюе ён школьніка. Многім з нас на ўсё жыццё запалі ў памяць цудоўныя вершы са школьных падручнікаў і хрэстаматый. Бывае ж так, што, як не імкнуцца дзеці, аж плачуць, а не могуць вывучыць верша, вывучыць які па падручніку загадалі ім настаўнікі. Бо ў нас бывае і так. У аднаго аўтара прыблізна на адну і тую ж тэму ёсць некалькі вершаў. Чамусьці часта здараецца, што з іх трапляе ў падручнік слабейшы. Трэба нам разам з Міністэрствам асветы, разам з нашымі педагогамі ў бліжэйшы час паклапаціцца, каб у нашых падручніках і хрэстаматыях змяшчаліся творы, якія б па-сапраўднаму ўсебакова выхоўвалі нашых дзяцей.

АБ НАШАЙ перыёдыцы. Рэдкалегія газеты «Літаратура і мастацтва» пачала больш цікавіцца зместам газеты, і пэўнае ажыўленне на яе старонках прыкметна. Часамі можна сустрэць і цікавы праблемны артыкул, і артыкул, які асвятляе якую-небудзь важную галіну з нашага жыцця. Мала, на жаль, выступаюць на старонках газеты нашы пісьменнікі, вось чаму і няма ў ёй больш-менш поўнага адлюстравання нашага літаратурнага жыцця.

Асноўны недахоп, уласцівы часопісу «Полымя», — гэта значная перавага твораў аб мінулым над творамі аб сучаснасці. Варта было б больш змяшчаць нарысаў аб сённяшніх днях часопісам «Беларусь», «Маладосць» і «Неман».

Многа хвалююць нашу пісьменніцкую арганізацыю справы распаўсюджання нашых часопісаў і кніг. Да гэтага часу тыражы многіх з іх устанаўліваюцца кнігагандлем выпадкова, невядома па якому прынцыпу. І часта выходзіць, што недасканалая, нават слабая кніга друкуецца шматтысячнымі тыражамі, а кніга мастацкая, патрэбная — абмежаваным тыражом. Чаму толькі працаўнікі прылаўка адыгрываюць ролю ва ўстанаўленні тыражу кнігі, чаму гэта мала залежыць ад выдавецтва, а Саюз пісьменнікаў пакінуты зусім у баку?

Чаму б не стварыць, прыкладна, такую камісію, куды б уваходзілі прадстаўнікі кнігагандлю, выдавецтва, Саюза пісьменнікаў, бібліятэк, вопытных чытачоў? Няхай бы яны разам вызначалі патрэбны тыраж кнігі. Можа, тады было б менш памылак.

Варта было б больш цікавіцца і тым, што павінна друкавацца з нашай літаратуры ў саюзных выдавецтвах. Усім вядома, што друкаванне ў Маскве надае пісьменніку шырокую папулярнасць. Мы радуемся, што наша проза і паэзія заслужылі ўвагу ўсесаюзнага чытача. Саюзу пісьменнікаў рэспублікі трэба зрабіць тыя ці іншыя захады, каб аблічча нашай літаратуры перад саюзным гледачом было найбольш поўным.

Некалькі слоў аб тым, як дапамагае нашай працы праўленне Саюза пісьменнікаў СССР. У нас няма ніякіх прычын скардзіцца на няўвагу. Відаць, што ўвагу з боку праўлення саюза мы маем такую ж, як і іншыя пісьменніцкія арганізацыі. Мы ўдзельнічаем ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіць праўленне Саюза пісьменнікаў СССР, ва ўсіх пленумах і нарадах, удзельнічаем у розных брыгадах, якія выязджаюць у тыя ці іншыя месцы. Прадстаўнікі праўлення саюза бываюць на нашых пленумах, дапамагаюць нам у правядзенні розных нарад. Але ёсць рэчы, якім Саюз пісьменнікаў СССР аддае недастаткова ўвагі. Возьмем хоць бы правядзенне Тыдняў братніх літаратур у рэспубліцы. Гэта адна з новых форм працы, якая заваявала ўсеагульнае прызнанне ў літаратараў і ў народа. Праходзяць яны параўнальна добра, але цікавяцца імі толькі тыя Саюзы пісьменнікаў, якіх сустрэчы датычацца непасрэдна. А праўленне Саюза пісьменнікаў СССР застаецца ў баку і часта даведваецца аб сустрэчах тады, калі яны ўжо адбыліся. Чаму б, скажам, аднаму з сакратароў праўлення не прысутнічаць на такіх тыднях? Колькі б гэта дало для сапраўднага абмену вопытам нашых літаратур ва ўсесаюзным маштабе.

Трэба аднавіць замацаваную М. Горкім традыцыю пасылкі калектыўных брыгад пісьменнікаў на важнейшыя будоўлі краіны, у выніку чаго з'явіліся б і калектыўныя творы.

Мала асвятляе жыццё нацыянальных літаратур «Литературная газета». Рэдкалегія яе па сутнасці не выканала наказу, які быў дадзены ёй у гэтай справе III з'ездам пісьменнікаў. Па тым, што друкуецца ў газеце, цяжка ўявіць становішча нацыянальных літаратур. Праўда, за апошні час газета зрабіла пэўныя зрухі (яна больш удзяляе ўвагі паказу нашай літаратуры, і за гэта мы ёй удзячны), пачала сістэматычна з'яўляцца хроніка аб літаратурным жыцці ў рэспубліках. Гэта добра. Але далёка недастаткова.

УВЕСЬ савецкі народ узяўся за выкананне Праграмы, вызначанай XXII з'ездам Камуністычнай партыі. І нам, савецкім літаратарам, належыць зрабіць шмат, каб быць дастойнымі таго гераічнага ўзлёту, якім жыве сягоння ўвесь савецкі народ. Партыя заклікае праўдзіва адлюстроўваць жыццё, і мы імкнёмся да гэтага. І вось сёння, кожны з нас, учытваючыся ў Праграму Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, думае, а што ж ён павінен зрабіць, каб яна была паспяхова ператворана ў жыццё?

Мы думаем пра Юрыя Гагарына і Германа Цітова. Як многа яны паспелі, гэтыя маладыя людзі, які складаны і чысты іх духоўны свет, якія шырокія інтарэсы.

Вялікую задачу задалі яны нам, савецкім пісьменнікам. Як расказаць аб нашых новых людзях, аб людзях, падобных нашым героям, ва ўсіх абставінах жыцця? Якія знайсці вобразы і словы? Які новы твор у недалёкай будучыні стане эпахальным, які твор надоўга возьме на сваё ўзбраенне наш народ, народ-творца?

Мала якія кнігі дасягаюць гэтага, мала імён застаецца ў памяці народнай навечна. І калі мы сёння можам назваць раманы, аповесці, паэмы, п'есы, героі якіх глыбока запалі ў сэрца народнае за сорак чатыры гады Савецкай улады, дык, канечне, кожнага з нас цікавіць, а якімі павінны быць кнігі, каторым суджана хваляваць народную душу ў бліжэйшыя дваццаць год, якія героі будуць жыць у іх?

Кожная эпоха высоўвае сваіх незабыўных герояў, якія найбольш поўна характарызуюць яе жыццё. І калі я думаю сёння пра тую кнігу, якой суджана стаць любімай народам, я ўяўляю, што яе галоўнымі героямі абавязкова будуць людзі нашых дзён, якія натхнёна будуюць новае, камуністычнае грамадства, людзі, падобныя на Гагарына і Цітова. Галоўны герой нашых дзён — новы савецкі чалавек, выхаваны партыяй у гады Савецкай улады, чалавек, які спазнаў і гора і радасць, гора жахлівай вайны і радасць мірнай працы, чалавек, для якога сацыялістычная Радзіма—усё жыццё. Ён сапраўды новы, гэты чалавек. Ён валодае многімі тымі прынцыпамі, якія партыя ў сваёй Праграме высоўвае як маральны кодэкс будаўніка камунізма. Ён працуе не толькі для сябе, а для ўсяго народа і не толькі для свайго народа, а для ўсяго чалавецтва. Тое, што мільёны прыгнечаных у свеце яшчэ чакаюць яго дапамогі, натхняе яго на яшчэ больш актыўную працу. Так, наш чалавек, атрымаўшы найвялікшыя перамогі ў сацыяльным жыцці і ў навуцы, заваяваўшы космас, валодае многімі рысамі чалавека камуністычнага грамадства. І вось здолець паказаць гэты новы вобраз савецкага чалавека — галоўная задача савецкай літаратуры і мастацтва.

Чаму мы гаворым аб удасканаленні майстэрства, але робім у справе павышэння майстэрства мала? Творам на важную тэму мы часамі даруем недасканаласць формы, а творам фармальна выкананым, калі можна так сказаць, з паказным умельствам, даруем іх унутраную пустату. Нам трэба, каб змест і форма твора былі дасканалыя. Трэба дамагацца таго, каб нашы творы адпавядалі таму, што сказаў В. Бялінскі пра «Рэвізора» Гогаля:

«У «Рэвізоры» няма сцэн лепшых таму, што няма горшых, але ўсе цудоўныя, як неабходныя часткі, якія па-мастацку ўтвараюць сабою адзінае цэлае...»

Імкнуцца стварыць твор, які адпавядаў бы такім высокім патрабаванням, — наша задача.

Мы павінны ўдасканальваць якасць нашых твораў, нястомна шукаць і ў галіне формы, але не ставячы гэта за самамэту. А як да гэтага трэба адносіцца, вельмі хораша сказаў нядаўна ў сваім выступленні ў «Правде» фінскі пісьменнік Марці Ларні. Мне б хацелася працытаваць яго:

«Кожнае дзесяцігоддзе прыносіць у літаратуру новыя эксперыменты над формай. Аднак толькі на іх аснове нельга пабудаваць нічога трывалага, таму што часта яны маюць толькі недаўгавечную прывабнасць навізны. Побач з формай павінен быць прапанаваны змест. Гэта ў свой час зрабілі Сяргей Ясенін, Аляксандр Блок і Уладзімір Маякоўскі, якія сёння такія ж сучасныя, як і 30 год назад. Калі б яны жылі да гэтага часу, яны, бясспрэчна, пісалі б пра 60-я, а не пра 20-я гады, таму што яны чэрпалі сваё мастацтва з крыніц свайго часу. На маю думку, усё роўна — ці выказвае пісьменнік свае думкі эпічна або абагулена: галоўнае заключаецца ў тым, каб ён выказваў свае думкі так, каб для іх разумення не патрабавалася асобных падручнікаў. Мова — гэта сродак выказвання. Яе прызначэнне праясняць, а не затуманьваць думкі. Бо тое, што сказана блытана, звычайна такое ж блытанае па думцы. Калі ператварыць дэталі літаратурнай формы ў самамэту, дык яна часта робіцца какецтвам, і тады чытач атрымоўвае права запытаць: піша пісьменнік для народа ці для свайго дробнага надзьмутага «я».

Я не хачу сказаць, што гэта вельмі актуальна для нас. У нас яшчэ няма таго, каб розныя крыўлянні і штукарствы засланялі змест, ідэю твора, але тое, што робіцца цяпер на Захадзе, дзе многія творы паэтаў невядома пра што напісаны і невядома адкуль іх пачынаць чытаць, — гэта павінна насцярожыць нас.

Мы павінны яшчэ больш натхніцца задачамі, якія пастаўлены перад намі, кіравацца правільным метадам — метадам сацыялістычнага рэалізму, які не адмаўляе разнастайнасці форм, але патрабуе, каб творы, напісаныя для народа, даходзілі да сэрца народа.

Увесь наш народ на гіганцкай будоўлі. Не можа быць сёння ў народнай гаспадарцы ўчастка, які б адставаў. Усім вядома, колькі ўвагі аддае наша партыя развіццю сельскай гаспадаркі. Нядаўна ў нас у Мінску адбылася нарада па сельскай гаспадарцы. Выступаючы на нарадзе, Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў крытыкаваў нас за адставанне сельскай гаспадаркі, а разам з тым раіў, што трэба зрабіць, каб у бліжэйшы час сельская гаспадарка Беларусі ўзнялася на належную вышыню. І ў выступленнях усіх удзельнікаў нарады адчуваўся непакой, як працаваць далей, як зрабіць так, каб у бліжэйшы час прадуктаў сельскай гаспадаркі было больш і лепшых.

Думаю, што мы не павінны заставацца ў баку. Справа беларускага народа, справа Камуністычнай партыі Беларусі — наша кроўная справа. Мы павінны дапамагчы народу дамагчыся большых ураджаяў на нашай зямлі, большага развіцця жывёлагадоўлі. А ў нас ёсць сродкі для гэтага: мастацкае слова. Усе жанры павінны быць закліканы і мабілізаваны. Нам трэба паказаць выдатных майстроў сельскай гаспадаркі, перадаць іх вопыт другім. Нам трэба ў сваіх творах рэзка крытыкаваць тых, хто дрэнна працуе, хто перашкаджае ўсеагульнаму ўздыму. Сёння гэта адна з асноўных нашых задач.

Калі паглядзець на тыя літаратурныя сілы, якія ў нас ёсць, і калі ўлічыць, што з кожным годам прыкметна расце ўмельства пісьменнікаў, можна спадзявацца, што мы выканаем тыя задачы, якія ўскладзены на нас нашай роднай партыяй, нашым народам.

Выканаем таму, што мы заўсёды ўсім сэрцам, усімі думамі былі са сваім народам, выканаем таму, што мы ўсім сэрцам, усімі думамі захоплены велічнаю праграмаю камуністычнага будаўніцтва, вызначанаю для ўсяго савецкага народа гістарычным XXII з'ездам партыі.

Мы павінны стварыць творы, якія б былі варты гераічных подзвігаў нашага народа, нашага вялікага часу, неабдымнай велічы нашай слаўнай Радзімы. Калі думаеш сёння аб яе бязмежнай велічы, міжволі шукаеш, як знайсці слова, каб ад усяго сэрца сказаць пра гэта.

Прыгадайце, з якім пафасам пісаў Гогаль аб сучаснай яму Русі...

Як жа, з якою сілай трэба сказаць сёння аб нашай Савецкай Радзіме, асветленай геніем вялікага Леніна, аб Радзіме, нястрымны рух якой вызначаюць не тройка коней, а касмічныя караблі, што імкнуцца на Месяц, у бязмежныя далі сусвету, як трэба сказаць пра Радзіму, якая змагаецца за шчасце ўсіх людзей на зямлі.

Мы павінны сказаць слова, якое б назаўсёды пакінула ў памяці людской непаўторную веліч нашага часу, мы павінны стварыць творы, якія б праславілі нашу перамогу. А ў нашай перамозе, у перамозе ленінскіх ідэй мы глыбока перакананы. Мы бачым, як сярод бурнага акіяна жыцця імкліва плыве наперад магутны карабель, які вядзе мудры, выпрабаваны рулявы, карабель, яркія пражэктары якога асвятляюць бязмежную высь, бясконцую глыбіню і неабдымныя прасторы вакол, карабель, на якім усім сэрцам адданная Радзіме вахта. А над караблём нашым гучыць дружная, звонкая баявая песня, песня, якую не заглушыць ніякім штормам і бурам: мы бачым, мы верым, што ўжо неўзабаве магутны савецкі карабель прыйдзе да свайго запаветнага берагу — да камунізма!

З маскоўскімі гасцямі М. Лесючэўскім і М. Гарбачовым гутараць заслужаны дзеяч культуры БССР А. Слесарэнка і І. Шамякін.

Фота А. Лукашова, Л. Эйдзіна.

Э. ЮШКЕВІЧ

КВЕТКІ ЖЫВЫЯ І МЁРТВЫЯ

ЦЯПЕР ЗЯМЛЯ бязлюдная і ціхая, быццам спіць, прыкрыўшыся бялюткай коўдрай снегу. Але пазыўныя вясны ўсё мацней гучаць над палямі. Пройдзе час і зноў неабсяжныя нівы загарацца мільёнамі кветак, зашумяць ураджаямі.

Зямля... Вечна чароўная і таямнічая, бязмежна багатая і чулая, родная, як маці. Нездарма ж з сівых стагоддзяў дайшлі да нас словы — «Маці багацця — зямля». А як мы любім яе, як дзякуем за яе незлічоныя даброты?

Такія думкі непакояць сёння кожнага савецкага чалавека. Непакояць у час, калі ў сельскай гаспадарцы адбываецца карэнная перабудова, ідзе напружаная барацьба за разумнае выкарыстанне кожнага кавалка зямлі.

Цяжкімі плітамі прыкрывала дагэтуль кладоўкі зямлі траваполле. Яно перашкаджала нашаму руху наперад, гірамі вісела на нагах. І калгаснае сялянства шле зямны паклон партыі, Мікіце Сяргеевічу Хрушчову, якія развянчалі травапольную сістэму, указалі хлебаробам правільны шлях.

Гэты шлях павінна асвятліць навука. Як верны компас, яна заклікана вывесці людзей з балота траваполля. Вось чаму думкі, погляды працаўнікоў зямлі звернуты да тых, хто заклікан рухаць навуку наперад, знаходзіць кароткія і самыя верныя шляхі да багацця. Гэтыя надзеі — на нашых вучоных, на іх будучую змену — сённяшніх аспірантаў.

ХТО Ж ТРАПЛЯЕ ў запаветныя лабараторыі навукова-даследчых інстытутаў, хто рыхтуе сябе да стараннай, захапляючай працы вучонага?

Людзі сустракаюцца розныя. Але галоўнае, што аб'ядноўвае іх, — гэта гарачая мара пранікнуць у таямніцы зямлі, паставіць іх на службу народу. І так хочацца, каб збыліся гэтыя светлыя мары, каб іх нялёгкія пошукі ўвянчаліся поспехам!

Асабліва ўзмацняецца гэтае пачуццё пры знаёмстве з аспірантам Інстытута земляробства Мікалаем Кулаком.

У яго абветраны, прыгожы твар. Задуменныя, спакойныя вочы. Адчуваецца: чалавек прывык думаць. І сапраўды, усё яго жыццё было прысвечана пошукам новага, лепшага. На «выдатна» закончыў сельскагаспадарчы інстытут. Паехаў працаваць у аддалены раён Брэстчыны — Гарадзішча. Хутка стаў галоўным аграномам саўгаса «Пачапоўскі». За гэтымі фактамі біяграфіі — гады нястомнай працы, радасці і, нярэдка, расчараванняў і роспачы.

Праз два гады Мікалай пакінуў саўгас, але яго там не скора забудуць. Вялікі энтузіяст кукурузы, малады спецыяліст праславіўся на ўсю рэспубліку яе высокімі ўраджаямі.

Нягледзячы на такі акрыляючы поспех, Мікалай усім сэрцам адчуў, што павінен удасканальваць свае веды, уменне, каб да канца зразумець магчымасці гэтай магутнай культуры. І ён падаўся ў аспірантуру, прад'явіўшы прыёмнай камісіі цікавы і змястоўны рэферат.

Праўда, кіраўнікі аспірантуры не далі хлопцу магчымасці працаваць над любімай тэмай. Але ён не разгубіўся і ахвотна пачаў распрацоўваць праблему вырошчвання ў рэспубліцы аднапарасткавых цукровых буракоў.

Птушку відаць па палёце. І сапраўды, за два гады навучання М. Кулак ужо дабіўся добрых вынікаў. Яго лабараторыяй стаў калгас «Новае жыццё» Карэліцкага раёна. На вачах усіх калгаснікаў ён праводзіць свае цікавыя доследы, а разам з гэтым кіруе ўсімі работамі па вырошчванню буракоў у калгасе.

Глыбокай павагай акружаны ў вёсцы будучы вучоны. Задаволен яго работай і навуковы кіраўнік, доктар сельскагаспадарчых навук прафесар А. Казлоўскі.

Такія людзі, як кветкі жывыя. Яны ўпрыгожваюць зямлю і жыццё. Многае ім дадзена зрабіць, многае здзейсніць. У навуку іх вядзе няўтольная прага да ведаў, імкненне зрабіць штосьці добрае для людзей. Гэта вучоныя па прызванню. Але знаёмства з аспірантамі, іх работамі і жыццём прыводзіць да думкі, што далёка не ўсе нясуць у сваіх сэрцах мару пакінуць свой след у навуцы. Сустракаюцца і зусім пустацветы. Па многа гадоў яны лічацца аспірантамі, прадаюць дзяржаўныя сродкі, але пальцам не паварушылі, каб знайсці што-небудзь сваё — новае, непаўторнае. Як матылі, пакруціўшыся вакол агню, яны і знікаюць бясследна. А нярэдка і само жыццё, умовы, у якія трапляе аспірант, блытаюць яго шлях, збіваюць з дарогі. Аб усім гэтым і думаеш напярэдадні чарговага Пленума Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі.

УАДНОЙ з устаноў Мінска, вельмі далёкай па профілю ад сельскай гаспадаркі, працуе Алена Канстанцінава. Закончыўшы сярэднюю школу, яна кідалася з інстытута ў інстытут, каб хоць дзе-небудзь затрымацца. Засталася вучыцца ў сельскагаспадарчым. Без прызвання, без любві да зямлі, яна і не думала быць аграномам. Скарыў яе горад. Атрымаўшы дыплом, яна ўладкавалася ў тым жа інстытуце асістэнтам.

Але абласны горад Гродна не мог задаволіць Алену, і яна перабралася ў Мінск і падала заяву ў аспірантуру пры Навукова-даследчым інстытуце земляробства. Так прыйшоў у навуку абыякавы чалавек, які не ставіў перад сабой сур'ёзнай мэты. Тры гады атрымлівала А. Канстанцінава дзяржаўную стыпендыю. А прайшло тры гады — развіталася, так нічога і не даўшы ўзамен за сродкі, якія пайшлі на яе ўтрыманне. За навуковую працу не сабралася ўзяцца. У калгасы не ездзіла.

Нягледзячы на гэта, Алену ніхто і не думаў выключаць з аспірантуры, хоць было кожнаму зразумела, што займае яна чужое месца. Цяпер яна працуе ў Рэспубліканскім інстытуце ўдасканальвання настаўнікаў.

Можна было б пералічыць яшчэ некалькі такіх вось «спадарожнікаў» навукі. Яны атрымліваюць дзяржаўныя стыпендыі, трутнямі сядзяць пры інстытутах.

Чаму ў навуку трапляюць людзі, абыякавыя да яе, такія, якіх бы трэба трымаць далёка ад сцен навукова-даследчых устаноў? Можа, прычына ў адсутнасці конкурсаў? Можа, не вядзецца ніякай работы па падрыхтоўцы да паступлення ў аспірантуру? Я гутарыў на гэтую тэму з вучоным сакратаром Інстытута земляробства тав. Захаравым.

— Работу па адбору праводзім, — сказаў ён. — Пасылаем аб'явы аб прыёме ў абласельгасупраўленні, а з імі — праграмы па замежнай мове, гісторыі партыі. Наладжваем кансультацыі...

Вось тут і закапаны сабака. Інстытут са скуры вылузваецца, каб аблягчыць паступленне ў аспірантуру, але нічога не робіць па адбору найбольш дастойных. Праўда, тут існуе адна фармальнасць. Той, хто паступае, павінен напісаць рэферат па тэме, якая яго цікавіць. Вывучаючы рэферат, прыёмная камісія і вызначае здольнасці да навукова-даследчай работы спецыяліста, які паступае ў аспірантуру. Але рэферат, які павінен быў быць галоўным пры вызначэнні мэтазгоднасці прыёму, на справе не з'яўляецца такім. Чалавек, залічаны на вучобу, рэдка атрымлівае для сваёй навуковай работы тую тэму, якая яго цікавіць і на якую ім напісан рэферат. Так было і з М. Кулаком. Пісаў рэферат аб агратэхніцы вырошчвання кукурузы ў саўгасе, а тэму атрымаў па бураках. Добра, што Мікалай — спецыяліст усебакова адукаваны, ініцыятыўны і настойлівы.

Значыць, першае, на што патрэбна было б звярнуць асаблівую ўвагу, — гэта адбор аспірантаў па якасці рэферата. Такі парадак даўно існуе пры маскоўскіх навукова-даследчых інстытутах. Калі работа атрымала высокую ацэнку, іншым умовам прыёму надаецца менш увагі. І правільна! Бо галоўнае ж для спецыяліста здольнасць да навуковай працы, яго цікавіць нейкая пэўная галіна навукі. У Беларусі ж такога парадку няма. Тэмы для даследчых работ размяркоўваюцца адвольна, абы выканаць план, абы ахапіць найбольшую колькасць пытанняў.

АСАБЛІВА трывожыць такое становішча цяпер, калі сельская гаспадарка, як ніколі раней, адчувае патрэбу ў навуковым абгрунтаванні прапашной сістэмы земляробства, яка прыходзіць на змену траваполлю. Людзі, якія ідуць у аспірантуру проста з вытворчасці, трэба шчыра прызнацца, часам лепш за вучоных разбіраюцца ў выгаднасці той ці іншай культуры, асабліва кукурузы, буракоў, бабовых. Яны і імкнуцца распрацоўваць шляхі атрымання іх высокіх ураджаяў. А што ж атрымліваецца ў інстытуце? З васемнаццаці аспірантаў другога і трэцяга года навучання толькі пяць працуюць над праблемамі кукурузы і двое — над цукровымі буракамі. Бабовымі ніхто не займаецца. Вось ён, вынік адвольнага падбору тэм вучонымі дзядзькамі-травапольшчыкамі!

Калі кукуруза, цукровыя буракі і боб — «кіты», як вобразна назваў іх Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, то і даследаваць трэба гэтых кітоў. А даследуюць малюскаў. Хіба не іроніяй на фоне апошніх падзей у сельскай гаспадарцы гучыць тэма аспіранта Расціслава Жамойдзіка — «Паскоранае стварэнне культурных пашаў на дзярнова-падзолістых і суглінкавых глебах (на прыкладзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Дзятлаўскага раёна)». Не травы, а збожжавыя культуры, кукурузу, буракі трэба сеяць на такіх землях!

Дарэчы, на якой жа базе думае напісаць сваю работу Р. Жамойдзік? Калгас «Чыр-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ПАД ДУДКУ КАЛАНІЗАТАРАЎ

— Чаго гэта грамадскасць так непакоіцца пра Антуана Гізенгу! Мы ж забяспечылі яму надзейную ахову.

Малюнак М. Жытніцкага.

З ЛЮБОЎЮ ДА ПАЭТА

ДА 80-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

1961 год быў годам падрыхтоўкі музея Янкі Купалы да юбілейнай даты — 80-годдзя з дня нараджэння народнага песняра. Уся работа навуковых супрацоўнікаў была падпарадкавана гэтай падрыхтоўцы. Юбілей шырока будзе адзначацца ў нас на Беларусі, а таксама ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Вільнюсе і гарадах іншых братніх рэспублік і ў краінах народнай дэмакратыі.

Музей падрыхтаваў да друку шэраг навуковых прац: «Даведнік па залах музея», зборнік «Народны паэт Беларусі», папулярны ілюстраваны нарыс «Літаратурны музей Янкі Купалы», «Янка Купала і беларускі тэатр», зборнік «Янка Купала ва ўспамінах сучаснікаў», разразны альбом аб жыцці і дзейнасці Я. Купалы, брашуру аб жыцці і творчасці народнага паэта. Большасць гэтых выданняў выйдзе з друку да юбілейнай даты, а асобныя ў канцы 1962 г.

У хуткім часе наведвальнікі атрымаюць даведнік «Літаратурны музей Янкі Купалы». У ім 10 раздзелаў і прадмова. У канцы кніжкі дадаткі — асноўныя даты жыцця паэта, бібліяграфія выданняў яго твораў на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах, крытычнай літаратуры аб песняру і найбольш характэрныя купалаўскія выказванні па пытаннях грамадскага і літаратурнага жыцця краіны. Даведнік з'яўляецца першай спробай даць навуковае асвятленне асноўных прынцыпаў распрацоўкі экспазіцыі і арганізацыі экскурсійнай работы буйнейшага беларускага нацыянальнага літаратурнага музея. У ім выкарыстоўваюцца шматлікія дакументы, фотарэпрадукцыі, фотаздымкі і карціны.

Навуковую каштоўнасць мае зборнік «Народны паэт Беларусі». У яго ўваходзяць даследчыя працы па асобных праблемах купалазнаўства, успаміны сучаснікаў (Ул. Дубоўкі, А. Бялевіча, М. Хведаровіча, С. Новіка, Я. Калітоўскага і інш.), выказванні пісьменнікаў, грамадскіх дзеячоў, вучоных. Асобны раздзел складаюць рэдкія і цікавыя дакументы. Многія з іх друкуюцца ўпершыню. У зборнік уключаны і хранікальна-інфармацыйныя нататкі. Усе гэтыя матэрыялы расказваюць аб дзіцячых і юнацкіх гадах паэта, яго сталасці, творчым росквіце, аб папулярнасці паэзіі вялікага песняра ў нашай краіне і за мяжой.

У падрыхтаваным да друку зборніку ўспамінаў аб вялікім беларускім паэце больш 50 аўтараў. Успаміны змешчаны ў храналагічным парадку, у адпаведнасці з біяграфіяй паэта.

Цёпла і сардэчна апавядае аб дзіцячых і юнацкіх гадах, аб фарміраванні светапогляду паэта, аб яго першых літаратурных вопытах яго сястра Л. Раманоўская. Аб шматгадовай дружбе з Іванам Дамінікавічам, якая пачалася яшчэ ў гады рэвалюцыйнага ўздыму (1912) ярка і пераканаўча расказвае народны паэт Беларусі Якуб Колас. Сардэчна напісаны ўспаміны Ул. Луцэвіч, Я. Хлябцэвіча, П. Мядзёлкі, у якіх асвятляецца жыццё і літаратурная дзейнасць паэта ў гады працы яго ў Вільні і ў час вучобы ў Пецярбургу. З вялікай любоўю ўспамінаюць аб сваіх сустрэчах з паэтам П. Глебка, Ул. Дубоўка, І. Гурскі, М. Лужанін, М. Машара, М. Хведаровіч, А. Міронаў, А. Бялевіч, П. Кавалёў і інш.

Я. Купала быў палымяным песняром брацкай дружбы паміж народамі. Гэтай тэме ён прысвяціў свае лепшыя творы. Ён вёў перапіску і падтрымліваў асабістыя кантакты з многімі пісьменнікамі братніх рэспублік. Гэты бок яго дзейнасці адлюстраваны ва ўспамінах М. Ціханава, Б. Ірыніна, П. Тычыны, Ул. Сасюры, Т. Масэнкі, А. Венцлавы і інш.

Надрукаваны таксама ўспаміны пра Купалу партыйных і савецкіх работнікаў, былых партызан, калгаснікаў, настаўнікаў. Яны сведчаць аб шчыльнай сувязі Я. Купалы з народам, аб яго таварыскасці, аб папулярнасці купалаўскай паэзіі, якая глыбока хвалюе савецкіх людзей, памагае ім будаваць камуністычнае грамадства.

Манаграфічная праца «Янка Купала і беларускі тэатр» разглядае праблемы драматургічнай творчасці народнага паэта і сцэнічнай гісторыі купалаўскіх твораў. У ёй прасочваецца таксама ўплыў драматургічнай творчасці на развіццё сучаснай беларускай драматургіі. Выкарыстаны новыя матэрыялы па гісторыі стварэння купалаўскіх п'ес і спектакляў, па мастацкаму чытанню купалаўскіх твораў, пастаноўках п'ес Я. Купалы ў народных тэатрах.

Каштоўным дапаможнікам для школ з'явіцца разразны альбом аб жыцці і творчасці Янкі Купалы. Кожная школа здолее арганізаваць у сябе выстаўку ці купалаўскі куток.

Усе гэтыя выданні, падрыхтаваныя навуковымі супрацоўнікамі музея, уносяць у купалазнаўства новыя факты і падзеі.

Навуковымі супрацоўнікамі музея таксама праведзена адпаведная работа па складанню бібліяграфіі твораў Янкі Купалы. Зараз вядзецца праца над III-й часткай бібліяграфіі (1942—1960), у якую ўвойдзе і літаратура, прысвечаная жыццю і творчасці паэта.

Распачата вывучэнне купалаўскіх рукапісаў. У фондах музея захоўваецца звыш 500 белавых і чарнавых рукапісаў, якія належаць да розных перыядаў літаратурнай дзейнасці паэта. Цяпер вядзецца вывучэнне дарэвалюцыйных рукапісаў двух зборнікаў «Жалейка» і «Шляхам жыцця». Нядаўна музей атрымаў ад Дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна каштоўнейшы экземпляр зборніка «Шляхам жыцця» (1913). Гэта карэктурныя лісты з праўкамі аўтара, якія раскрываюць творчую лабараторыю паэта і сведчаць аб сур'ёзнай яго рабоце ў час падрыхтоўкі зборніка да друку.

За мінулы год музей папоўніўся новымі цікавымі матэрыяламі — рэдкімі фотаздымкамі Я. Купалы, кнігамі паэта, часопісамі і газетамі з яго вершамі, пісьмамі і тэлеграмамі, якія паказваюць адносіны вялікага мастака да літаратуры братніх народаў.

А. Шанідзе, які сустракаўся з паэтам у Тбілісі, Цхалтуба і Мінску, перадаў музею пісьмы і фотаздымкі Янкі Купалы, а таксама малюнкі, зробленыя невядомым мастаком. Перадаў музею два пісьмы Янкі Купалы літаратуразнаўца і перакладчык Я. Мазалькоў. Адно пісьмо, адрасаванае рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь» (перыяду Вялікай Айчыннай вайны), перадаў пісьменнік Васіль Вітка. Член-карэспандэнт АН СССР В. Баркоўскі і яго жонка Н. Баркоўская (дачка вядомага філолага, акадэміка Я. Карскага) перадалі музею экземпляр газеты «Наша Ніва» ад 16 мая 1914 г., дзе змешчаны артыкул Янкі Купалы аб Ул. Эпімах-Шыпілу, першым пастаноўшчыку камедыі «Паўлінка» ў дарэвалюцыйным Петраградзе. Баркоўскія даслалі і некалькі нумароў газеты «Савецкая Беларусь» за 20-я гады, у якіх надрукаваны 10 вершаў Янкі Купалы і многа матэрыялаў аб ім.

Папоўніліся фонды музея і выданнямі твораў Янкі Купалы, якія сталі ўжо бібліяграфічнай рэдкасцю. Тут маюцца на ўвазе яго першыя кніжкі «Жалейка» (1908), «Гусляр» (1910), «Адвечная песня» (1910),» «Шляхам жыцця» (1913), «Сон на кургане» (1913)».

Музей вядзе вялікую папулярызатарскую работу.

За 16 год з часу адкрыцця музея з яго матэрыяламі пазнаёмілася каля 300 000 чалавек. А ў 1961 г. музей наведала 458 экскурсій. Музей і яго філіял у Вязынцы сёлета наведала 31 858 чалавек. З музеем пазнаёміліся экскурсанты сонечнай Грузіі і далёкай Якуціі, Украіны і Малдавіі, Літвы і Узбекістана, дэлегацыі турыстаў з Польшчы і ГДР, Венгрыі і Канады, Чэхаславакіі і Югаславіі. Асабліва часта наведваюць музей настаўнікі, калгаснікі, з якімі некалі сустракаўся паэт, пісьменнікі, мастакі, артысты, кампазітары і іншыя, якія не раз гасцявалі ў доме Янкі Купалы.

Пры музеі сістэматычна працуе лекторый. За мінулы год праведзена 20 літаратурных вечароў. Два вечары праведзены ў калгасах Любаншчыны і Лагойшчыны.

Навуковыя супрацоўнікі музея на заводах і фабрыках Мінска выступаюць з дакладамі і гутаркамі аб жыцці і творчасці Я. Купалы.

Юбілей Янкі Купалы — усенароднае свята, яно будзе шырока адзначацца ўсёй савецкай грамадскасцю і ў краінах народнай дэмакратыі.

А. ЕСАКОЎ,
І. ЖЫДОВІЧ.

КВЕТКІ ЖЫВЫЯ І МЁРТВЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

воны Кастрычнік» Дзятлаўскага раёна з'яўляецца адной з адстаючых гаспадарак вобласці. Непрыглядная была ў мінулыя гады структура пасяўных плошчаў. Важнейшыя кармавыя культуры займалі нязначны працэнт, затое травы былі на першым плане. Вось чаму ў мінулым годзе на сто гектараў угоддзяў калгас атрымаў усяго 141,4 цэнтнера малака, а ад кожнай каровы надоена па 1 407 кілаграмаў. Калі б і хацеў знайсці ніжэйшыя паказчыкі па вытворчасці малака ў рэспубліцы, то, напэўна, не знайшоў бы. Па мясу тут таксама паўнейшы правал. Яго атрымана на сто гектараў зямлі ўсяго па 17,2 цэнтнера. Хіба невядомыя гэтыя лічбы аспіранту і яго навуковаму кіраўніку Дзмітрыю Аўрамавічу Забеле? Вядомы, але што з таго. Ім бы толькі прапіхнуць свой пункт гледжання на травы.

Радавыя хлебаробы ідуць у нагу з жыццём, скарачаюць пасевы траў за кошт пашырэння збожжавых, кукурузы і буракоў, а аспірант Р. Жамойдзік і яго кіраўнік Д. Забела раўняюцца на мінулае, аджыўшае. І як тут не ўспомніць словы Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, сказаныя ім нядаўна на нарадзе работнікаў сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны РСФСР: «Простыя людзі ў калгасах і саўгасах атрымліваюць больш збожжа, мяса, малака, чым атрымліваюць дследныя гаспадаркі па рэцэптах такіх вучоных. Прабачце за грубасць, але як тут не сказаць: на якога д'ябла патрэбна народу такая «навука»!».

Гэта ў поўнай меры адносіцца да тав. Забелы. У мінулым годзе, калі ўжо травапольная сістэма скампраметавала сябе канчаткова, ён выпусціў брашуру аб стварэнні культурных пашаў, у якой ўсяляк ухваляе травы, рэкамендуе іх сеяць не толькі ў лугавых севазваротах, а і на ворнай зямлі і асабліва на асушаных тарфяніках. Гэта з дапамогай такіх вучоных, як тав. Забела, беларускія тарфянікі на 60 працэнтаў былі заняты травамі. А асушаныя ж балоты — гэта залатое дно ўраджаю каштоўных культур — збожжавых і тэхнічных.

М. С. Хрушчоў на нарадзе работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі рэзка крытыкаваў бесгаспадарчае выкарыстанне асушаных тарфянікаў. Гэта выдатныя землі. У нас ёсць сотні гаспадарак, якія атрымліваюць высокія ўраджаі кукурузы, буракоў, бабовых. І ўсё ж тарфянікі застаюцца мала вывучанымі. Ды і не дзіўна. Ні Інстытут земляробства, ні Інстытут меліярацыі, заблытаўшыся ў траваполлі, і мэты не ставілі вывучаць і рацыянальна выкарыстоўваць асушаныя балоты. Ні адзін аспірант не прыцягнуты да распрацоўкі гэтай тэмы. Затое з якім поспехам даследуецца такі «малюск», як баркун, які пустазеллем расце на абочынах праезджых дарог. Яму надаецца ледзь не рэвалюцыйнае значэнне ў сельскай гаспадарцы. Вось ужо сапраўды: робяць з мухі слана!

САМ ПРАЦЭС, методыка падрыхтоўкі будучых вучоных пакідаюць чакаць многа лепшага. Першае патрабаванне, якое прад'яўляецца да аспіранта, — гэта своечасова, па дэталёва распісанаму раскладу здаваць розныя «мінімумы». Аспіранту, які працуе, скажам, дзесьці ў далёкім калгасе, перш за ўсё руплць не дослед, а думка: як бы не адстаць, своечасова здаць экзамены. Таму і здараецца часта, што пакуль аспірант разлічыцца з кандыдацкім мінімумам, глядзіш — і два гады праляцела. На навуковую працу часу застаецца мала. У выніку ў беларускіх інстытутах ніхто не ведае і не памятае выпадку, каб аспірант абараніў дысертацыю за час свайго навучання.

Нельга тут даць гатовых рэцэптаў. Гэтае пытанне патрабуе шырокага абмеркавання. Але варта было б прыгледзецца да практыкі падрыхтоўкі аспірантаў у Польскай Народнай Рэспубліцы. Галоўная ўвага ўдзяляецца там напісанню дысертацыі. І толькі пасля гэтага аспірант здае кандыдацкі мінімум.

Могуць запярэчыць: а як жа з замежнай мовай? Без яе ведання нельга ўсебакова вырашыць пастаўленую перад сабой праблему. Патрэбна многа чытаць замежнай літаратуры. Гэтае пытанне не такое ўжо і складанае, як здаецца на першы погляд. Проста можна павысіць патрабаванні пры паступленні ў аспірантуру, не залічаць людзей, якія не валодаюць неабходным мінімумам ведаў па замежнай мове.

Непрадуманы план здачы кандыдацкага «мінімуму» — толькі адна з прычын нездавальняючай падрыхтоўкі аспірантаў, затрымкі з напісаннем дысертацый. Ужо з першых дзён навічка чакае многа незразумелых, а часам нечаканых рэчаў. Даручыўшы тэму, яму прызначаюць навуковага кіраўніка. У большасці выпадкаў кіраўнік павінен мець доктарскае званне. Пагоня за дактарамі прыводзіць да таго, што за адным кіраўніком замацоўваюцца дзесяткі аспірантаў. Вынікі атрымліваюцца нежаданыя. Вучоны не ў стане забяспечыць усіх глыбокімі, змястоўнымі кансультацыямі, наладзіць штодзённае кіраўніцтва работамі.

А чаму абавязкова навуковым кіраўніком павінен быць доктар навук? Чаму так баязліва даручаюць гэтую справу вопытным кандыдатам навук? Супраць такой практыкі і традыцыі выказваюцца самі аспіранты. Мне давялося гутарыць з многімі. І ўсе яны заяўляюць у адзін голас, што гэты парадак патрэбна мяняць.

Хто ў нас не ведае і не цэніць выдатнага вучонага, таленавітага арганізатара, акадэміка Міхаіла Яфрэмавіча Мацапуру. Машыны, створаныя інстытутам пад яго кіраўніцтвам, выклікаюць шчырае, глыбокае захапленне. Але, акрамя М. Мацапуры, у інстытуце працуе нямала іншых заслужаных вучоных і практыкаў. Чамусьці ж акадэмік адзін кіруе навуковымі работамі 24 аспірантаў. Якая б эрудыцыя ні была ў вучонага, ён не ў сілах ажыццявіць кіраўніцтва распрацоўкай такой колькасці тэм.

Можна прывесці такі прыклад. Яшчэ ў 1957 годзе ў аспірантуру пры Навукова-даследчым інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі паступіў інжынер Барыс Гарбузаў. Хоць ён працаваў дырэктарам электрастанцыі, але тэму атрымаў па ацяпленню і вентыляцыі жывёлагадоўчых ферм. Ды гэта няважна. Прайшло амаль пяць гадоў, а тав. Гарбузаў фактычна не прыступаў да работы. Навошта ж былі выкінуты на вецер тысячы рублёў дзяржаўных сродкаў, затрачаных на ўтрыманне аспіранта? Б. Гарбузаў гаворыць, аддаючы належнае вялізарнаму вопыту акадэміка М. Мацапуры, што яго кіраўніком з большай карысцю маглі б быць кандыдаты навук. А. Жылін, М. Свярнёў, В. Сцепанчук, профіль работы якіх найбольш блізкі да тэмы аспіранта.

Я спытаў, калі Б. Гарбузаў у апошні раз гутарыў па тэме са сваім кіраўніком.

— Мінулым летам, — быў адказ.

Каментарыі тут непатрэбны!

І ўсё ж, як гэта ні парадаксальна, Б. Гарбузаву пашанцавала. Яму толькі адзін раз мянялі тэму і зусім не мянялі кіраўнікоў. А вось аспіранты Навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі жывуць пад вечным страхам выкліку да навуковага кіраўніка, які сваю размову звычайна пачынае так:

— Ну, браце, давай падумаем наконт такой тэмы...

Усё, над чым аспірант працаваў раней, ляціць дагары нагамі, а разам з імі — і надзея абараніць калі-небудзь дысертацыю. Многа разоў мянялі тэму аспірантам Віктару Старкову, Марыі Хрушчовай і іншым. А як часта мяняюцца навуковыя кіраўнікі! Усё гэта, калі назваць уласным імем, і будзе чысцейшай абыякавасцю да падрыхтоўкі будучых вучоных.

ЯК ТОЛЬКІ наступае вясна, на доследных станцыях пачынаецца вавілонскае стаўпатварэнне. Сюды імкнуцца ўсе — ад масцітых вучоных да пачынаючых дследнікаў-аспірантаў. Кожны імкнецца захапіць сабе кавалак зямлі, угнаіць і апрацаваць яго, каб закласці эксперымент. А паколькі землі на станцыях неадналькавыя, пачынаюцца невясёлыя размовы. Нарэшце, у страшных пакутах участкі дзеляцца, выстаўляюцца палачкі. Далей уваходзіць у сілу прынцып — «выкручвайся, хто як можа». Ён расшыфроўваецца так: патрэбны табе ўгнаенні — даставай, дзе хочаш, хоць на неба лезь. Рабочая сіла спатрэбілася для апрацоўкі ўчастка?

— Паслухайце! — адказвае кіраўнік станцыі.—Не пайду ж я сам араць ваш участак!

І г. д. і да т. п.

Пачынаецца пагоня за кожным рабочым, які можа трымаць у руках плуг і паганяць каня, за кожным трактарыстам, які ўмее вадзіць машыну.

У выніку тэрміны сяўбы зрываюцца, задуманыя прыёмы агратэхнікі парушаюцца, блытаюцца планы, псуецца настрой. Не ва ўсіх, вядома. Гарласты і мускулісты чалавек выходзіць пераможцам. А навічкі, аспіранты? Яны задавальняюцца крошкамі са стала, тым, што нікому ўжо непатрэбна. І так на працягу ўсяго лета.

Хай сабе на доследных станцыях інстытутаў праводзілі свае эксперыменты пяць, дзесяць, ну, дваццаць чалавек. Але ж там збіраюцца многія дзесяткі людзей! Дык ці не пара адкрыць вароты станцый, і выпусціць адтуль работнікаў на шырокую волю? Паглядзіце, таварышы вучоныя, якія бязмежныя палі распасціраюцца навокал. А колькі рабочай сілы — і не падлічыш... Любы калгаснік, з уласцівай яму прагай да новага, стане вашым лепшым памочнікам, ды і сам таму-сяму навучыцца!

Вучоныя і асабліва аспіранты закліканы працаваць, праводзіць свае даследаванні на калгасных і саўгасных палях. У адной пастанове партыі і ўрада прама гаворыцца, што абараніць дысертацыю можна толькі тады, калі дысертант укараніў на практыцы, у вытворчасці свае доследы. Праўда, некаторыя, хоць і нясмелыя крокі зроблены ў гэтым напрамку. Аспірант Інстытута земляробства Аляксандр Сушчэвіч працуе над тэхнікай насенняводства цукровых буракоў. Свой першы дослед па атрыманню насення буракоў бязвысадачным спосабам ён правёў у Скідзельскім буракасаўгасе, а таксама ў саўгасе «Рачкавічы» Мінскай вобласці. Доследы ўдаліся. Саўгасы ўбачылі, што яны з поспехам могуць атрымліваць уласнае насенне. На гэты год пакінулі па пяць—шэсць гектараў з матачнікамі гэтай культуры і атрымаюць летам многія тоны свайго насення.

Вось гэта і гаворыць на карысць работы на калгасных і саўгасных палях! Няхай тут цяжэй праводзіць розныя хімічныя аналізы. Затое ўсякае добрае адкрыццё знойдзе тут гарачых прыхільнікаў і неадкладна набудзе правы грамадзянства.

І АПОШНЯЕ, на чым хацелася б спыніцца, гэта на тых «залатых горах», якія абяцаюць кожнаму аспіранту ў пачатку яго вучобы. Возьмем, да прыкладу, знаёмых ўжо нам М. Кулака і А. Сушчэвіча, якія працуюць над праблемамі аднапарасткавых цукровых буракоў. У плане іх работ сярод шматлікіх пунктаў ёсць і такі: штогадовая паездка на Украіну, у навукова-даследчы інстытут. На вялікі жаль, гэты важнейшы пункт амаль не ажыццяўляецца.

Як вядома, радзіма аднапарасткавых буракоў — Украіна. Стваральнікам гэтага віду буракоў прысуджана Ленінская прэмія. Яны займаюць на Украіне сотні тысяч гектараў і даюць выдатныя ўраджаі. У нас жа, у Беларусі, на працягу многіх гадоў пад аднапарасткавыя буракі адводзяцца карлікавыя ўчасткі — і толькі для эксперыментаў вучоных. Фактычна мы ідзём усляпую, як кажуць, шукаем люльку, якая дыміць пад носам. Сапраўды, чаму б не з'ездзіць аспіранту на Украіну? Праўда, глебавыя ўмовы рэспублікі адрозніваюцца ад украінскіх, але прынцып вырошчвання буракоў, арганізацыя справы застаюцца аднолькавымі. Няхай бы аспірант сваімі вачыма ўбачыў тое, што рупліва шукае ў кнігах.

А якім бы адкрыццём для нашых будучых вучоных-буракаводаў было б практычнае знаёмства з дасягненнямі праслаўленага кубанскага буракавода, Героя Сацыялістычнай Працы тав. Святлічнага, вопыт якога, умельства сталі ўсесаюзным універсітэтам!

Можна было б гаварыць яшчэ аб многім. І аб тым, што аспірантаў не вучаць методыцы закладкі доследаў, не арганізуюць для гэтага лекцый і семінараў (рабі, маўляў, як умееш), не праводзяць канферэнцый маладых вучоных. І аб тым, у якіх непрыглядных бытавых умовах жывуць аспіранты, — што ў цесных пакоях знаходзіцца і працуе па дзесяць і больш чалавек і г. д. Усё гэта можна растлумачыць толькі няўвагай Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР да падрыхтоўкі вучоных кадраў, да стварэння ім належных умоў. А гэтае пытанне не церпіць адкладання, бо няма цяпер больш высакароднай мэты і задачы, як пераўтварэнне нашай сельскай гаспадаркі ў самую перадавую, у самую квітнеючую ў свеце.

Падзеі. Факты. Навіны

□ Нядаўна адбыўся сход работнікаў кіно Пінскага раёна. Намеснік загадчыка раённага аддзела культуры В. Нагарняк зрабіў даклад аб выніках работы кінасеткі за мінулы год і задачах на 1962 г. Кінафікатары раёна датэрмінова выканалі гадавы план па ўсіх паказчыках. Дзевяць кінаўстановак выканалі гадавыя планы яшчэ 1-га снежня.

За поспехі ў рабоце двум сельскім стацыянарам — Малатковіцкаму і Пінкавіцкаму прысвоена высокае званне калектываў камуністычнай працы. Званне ўдарніка камуністычнай працы заваяваў кінамеханік Гарадзішчанскага стацыянара тав. Карабухін.

Кінафікатары раёна прынялі абавязацельствы на 1962 год. Яны абавязаліся абслужыць звыш плана 50 тысяч гледачоў, а гадавы план выканаць да 5 снежня. Калектыў Малатковіцкага стацыянара ў 1962 годзе арганізуе сваю работу так, каб кожны жыхар пасёлка пабываў за год у кіно не менш 40 разоў. Для юнага гледача пры стацыянары створан дзіцячы кінатэатр, які працуе на грамадскіх асновах.

Кінафікатары Піншчыны выклікалі на спаборніцтва работнікаў кінасеткі Столінскага раёна.

□ У Доме культуры гарадскога пасёлка Парычы адбылася сустрэча чытачоў з пісьменнікам А. Лазнявым. Ён расказаў прысутным аб сваёй рабоце над аповесцю «Дарога ў горы», прачытаў некалькі баек і вершаў.

Такая ж сустрэча адбылася і на заводзе штучнага валакна ў Светлагорску.

□ Сельскім гледачам рэспублікі паказваюць сваё мастацтва артыстычныя брыгады Белдзяржфілармоніі. На калгасных і раённых сцэнах выступаюць спевакі, чытальнікі, музыканты. На гастролі ў Гомельскую вобласць выехала брыгада, якую ўзначальвае Р. Дзідэнка. На раённых сцэнах Віцебшчыны выступае калектыў пад кіраўніцтвам М. Шышкіна.

□ Пры мінскім кінатэатры «Цэнтральны» ўжо другі год існуе маладзёжны савет сяброў кіно. У яго рабоце прымаюць актыўны ўдзел рабочыя і служачыя, студэнты і работнікі бібліятэк. Члены гэтага савета прапагандуюць лепшыя творы савецкай кінематаграфіі, праводзяць гутаркі і лекцыі, канферэнцыі гледачоў, абмеркаванне кінакарцін.

На бліжэйшы час савет запланаваў выступленні мастацкай самадзейнасці і гутаркі «Камунізм і мастацтва», «Выдатныя творы кіно 1961 года», «У сучасніку нашым камунізма рысы».

ЗАВОДСКІЯ БІБЛІЯТЭКІ

Звыш шасці тысяч кніг на паліцах бібліятэкі Гомельскага завода гандлёвага абсталявання. Сюды штодзённа прыходзіць 11 газет, выпісана 35 часопісаў. У бібліятэцы бяруць кнігі 310 работнікаў прадпрыемства.

3.175 тамоў кніг па розных галінах ведаў — такі кніжны фонд бібліятэкі Гомельскага дзяржаўнага падшыпнікавага завода. Свае абанементныя карткі тут маюць 376 рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых. Кніжны фонд бібліятэкі ўвесь час расце. Летась на набыццё літаратуры было выдаткавана 500 рублёў. Значныя сродкі выдзелены бібліятэцы і сёлета. Разам з заводскім камітэтам камсамола бібліятэка рэгулярна выпускае вусны часопіс «Хачу ўсё ведаць».

За апошні час значна актывізавалі сваю работу бібліятэкі Гомельскага электратэхнічнага завода, паравознага дэпо, кандытарскага камбіната «Спартак» і іншых прадпрыемстваў Гомеля. У бібліятэках рэгулярна наладжваюцца літаратурныя выстаўкі, шырока прапагандуюцца матэрыялы XXII з'езда КПСС.

В. СЯМЕНАЎ.

☆

— А вось гэтая кніжка вам абавязкова спадабаецца, — гаворыць маладым пакупніцам вялікі энтузіяст кніжнага гандлю Надзея Мецелева. Дзяўчаты ўважліва слухаюць парады, і вядома, купяць новы твор любімага пісьменніка.

Так штодзень з вялікай зацікаўленасцю працуе кіяскёр Н. Мецелева. Яе столік з кнігамі стаіць у гандлёвай зале Добрушскага раённага універмага. Сюды прыходзіць многа пакупнікоў. І амаль кожны спыняецца ля кніжнага кіёска. Клапатлівы прадавец Надзея Мецелева абавязкова параіць набыць патрэбную і цікавую кніжку.

Фота М. Старчанкава.

НА МІНСКІМ АЎТАМАБІЛЬНЫМ

У ЗНАК ДРУЖБЫ

Даўняя дружба звязвае мінскіх і маскоўскіх аўтамабілебудаўнікоў. А цяпер вытворчыя сувязі папоўніліся і літаратурнымі: паэты і празаікі двух аўтазаводаў знаёмяць адзін аднаго са сваёй творчасцю.

Гэтымі днямі ў шматтыражцы мінскіх аўтамабілебудаўнікоў апублікавана «Літаратурная старонка», падрыхтаваная рэдакцыяй «Московского автозаводца».

Сваю «Літаратурную старонку» адправілі ў Маскву мінчане. Тут прадстаўлены вершы ліцейшчыка К. Гляйхенгаўса, электрыка А. Ранькоўскага, былога рабочага завода цяпер студэнта Беларускага універсітэта Х. Чэрні, апавяданне слесара В. Цішкова.

НА СЦЭНЕ НАРОДНАГА ТЭАТРА

Плённым быў мінулы год для калектыву заводскага Народнага тэатра: пастаўлены спектаклі «Лявоніха на арбіце» і «Заводскія хлопцы». Новыя работы з поспехам былі паказаны аўтамабілебудаўнікам Мінска і Жодзіна.

Артысты Народнага тэатра пад кіраўніцтвам галоўнага рэжысёра тэатра, заслужанага артыста Казахскай ССР К. Арбеніна рыхтуюць да пастаноўкі два новыя спектаклі — «Глыбокая разведка» і «Сібірская навела».

З КАНЦЭРТАМІ — У КАЛГАСЫ

Калгасны клуб поўны. Гэта на сустрэчу са сваімі шэфамі—мінскімі аўтазаводцамі прыйшлі калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны партызан» Валожынскага раёна. У зале гучыць у выкананні канструктара І. Дрэйзена песня Н. Сакалоўскага «Нёман». Затым па-майстэрску выконваюць «Беларускую польку» ўдзельнікі ансамбля народнай песні і танца заводскага Дома культуры Т. Галякевіч, М. Мыцько, Я. Вайцяховіч, П. Няборскі. Іх змяняюць дэкламатары.

Аўтазаводцы — частыя госці ў валожынцаў: у мінулым годзе адбыліся 23 канцэрты ў падшэфным раёне.

ВЫТВОРЧАСЦІ СТУДЫІ «МАЗФІЛЬМ»...

Работы студыі «МАЗФІЛЬМ» яшчэ не вядомы шырокаму гледачу. Гэтымі днямі заводскія кінааматары паказалі свой першы фільм, прысвечаны жыццю спартыўнага калектыву прадпрыемства.

Вядуцца здымкі другога фільма, які таксама будзе прысвечан жыццю аўтазаводцаў.

Я. КАРПОЎСКІ.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

Міністэрства культуры БССР выказвае глыбокае спачуванне народнаму артысту СССР Яўгену Карлавічу Цікоцкаму з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці жонкі Марыі Арсеньеўны ЦІКОЦКАЙ.

Кампазітары рэспублікі выказваюць глыбокае спачуванне Яўгену Карлавічу Цікоцкаму з прычыны цяжкага гора, якое напаткала яго, — смерці жонкі Марыі Арсеньеўны ЦІКОЦКАЙ.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне Яўгену Карлавічу Цікоцкаму з прычыны смерці яго жонкі.

Калектыў Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцягу філармоніі выказвае глыбокае спачуванне народнаму артысту СССР Я. К. Цікоцкаму з прычыны вялікага гора — смерці яго жонкі Марыі Арсеньеўны.

Калектыў Рэспубліканскага дома народнай творчасці з жалем паведамляе аб смерці таленавітага самадзейнага мастака, разбяральніка інструментара ГЕБЕЛЕВА Рыгора Львовіча і выказвае глыбокае спачуванне сям'і нябожчыка.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва— 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03. «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00039

Друкарня выдавецтва «Звязда».